Уладзімір Арлоў

# 100
## выдатных дзеячаў





# Уладзімір Мулявін



*Федар Гулевіч, Уладзімір Арлоў, Уладзімір Мулявін, Аляксандар Варанецкі, Уладзімір Місевіч*



*Барткевіч, Тышка, Місевіч, Мулявін. 1971 год*

100 выдатных дзеячаў беларускай культуры

Уладзімір АРЛОЎ

# Уладзімір Мулявін

## Рускі чалавек з беларускай душой

Мінск
Харвест

*Серыя заснавана ў 2012 годзе*

*Заснавальнік, каардынатар і рэдактар серыі*
*А. Я. Тарас*

*Мастацкае афармленне серыі Б. Г. Клюйка*

*Аўтар і рэдактар-складальнік удзячны*
*Зміцеру Калесніку за дапамогу ў выданні кнігі*

**Арлоў У.**

Уладзімір Мулявін : Рускі чалавек з беларускай душой / У. Арлоў. — Мінск : Харвест, 2016. — 64 с. : малюнкі. — (Серыя «100 выдатных дзеячаў беларускай культуры»).

ISBN 978-985-18-3841-3

Уладзімір Мулявін (1941—2003) — знакаміты дзеяч беларускай музычнай культуры, заснавальнік і кіраўнік славутага ансамбля «Песняры». Менавіта ён разам са сваім гуртом пазнаёміў свет з краінай пад назвай Беларусь. І менавіта ён ва ўвесь голас узгадаў беларусам, што яны — беларусы. І што беларускія песні — цудоўныя!

**ISBN 978-985-18-3841-3**

© У. Арлоў, 2016
© Вокладка. Харвест. 2016

*«Познавший многия радости*
*познает и многия скорби»*
Стары Запавет. Эклезіяст

Заяўляю адразу: сябрамі з Мулявіным мы не былі, ніколі не сядзелі разам за накрытым сталом, не спавядаліся. Але болей за мяне «Песняроў» ніхто не здымаў, пачынаючы з 1971 года, з тае чорна-белай стужкі, з трохпавярховай «батлейкі», пабудаванай у 2-м павільёне «Беларусьфільма».

***Леанард Барткевіч:*** Той фільм твой – такое было ўражанне тады, што здымаецца пад нейкую даўніну. Калі цяпер гэта аглядаеш, аказваецца, было зроблена спецыяльна, геніяльна задумана, як стыль адзначаны.

***Святлана Пенкіна:*** Іх шмат здымалі, але гэта ўсё канцэрты. А твой фільм 71-га года так і застаўся адзіным пастановачным, у якім ззяе першы склад.

І ў наступныя гады мы саўдзельнічалі ў кінапрацы. Ад музыкантаў чуў аб крызісе ў гурце, аб падзеле калектыву. Яшчэ ў 2001-м у кнізе «Магія белага экрана» я сумаваў: «Мулявін адзін можа рабіць тое, што кожны „пясняр“ у асобнасці. Гурт – нацыянальны скарб Беларусі. А скарб лепей не дзяліць».

Але – падзялілі, разарвалі, расхапалі, змяльчылі... Што ж за феномен беларускага савецкага мастацтва, усясветна вядомы гурт «Песняры»? Што за асоба яго лідар – Уладзімір Георгіевіч Мулявін?

Нарадзіўся ў Свярдлоўску 12 студзеня 1941-га ў радзіне працоўных «Уралмаша»...

Але не буду страчваць месца на энцыклапедычныя даведкі. Апішу мала ці амаль невядомае.

* * *

Два найвялікшыя аўтарытэты ў галіне музычнага фальклора Беларусі, Рыгор Шырма і Генадзь Цітовіч, абодва народныя артысты СССР, выступілі супраць самога існавання «Песняроў». На паседжанні праўлення Саюза кампазітараў стаяла пытанне аб забароне і расфарміраванні калектыву. Аргумент Цітовіча:

> Мулявін паклаў беларускую песню ў жорсткі фармат сучаснай эстрады і тым самым нанёс ёй шкоду. Гэта ўсё роўна, што пераапрануць васняцоўскую Алёнушку ў міні-спадніцу!

Але рашуча пярэчыў ім першы ў нашыя часы найяскравейшы носьбіт беларушчыны і нацыянальнага ўсведамлення пісьменнік Уладзімір Караткевіч:

> Можна любіць і народны хор, і «Песняроў». Можна не любіць. Толькі не трэба рабіць выгляд, быццам бы наша песня, так проста, сама сабой вырвалася на прасторы Радзімы, загучала ў Балгарыі, Чэхаславакіі, Польшчы. Гэта зрабілі «Песняры».

Белдзяржфілармонія рабіла выгляд, што чакае загада аб скасаванні гурта ад Міністэрства культуры, але ведала, што загада не будзе: «Песняры» сваімі аншлагамі — нават на стадыёнах — літаральна «кармілі» яе камерны хор і сімфанічны аркестр.

З'яўленне і дзейнасць у Беларусі стваральніка славутага гурта, апалагета рок-«беларушчыны», і тое, што ён атабарыўся менавіта ў Мінску можна лічыць выпадковым.

Да таго працаваў Мулявін у шмат якіх філармоніях СССР і там здолеў бы зрабіць гурты «Калевала», «Манас», «Сакартвэла» ці «Запарожцы». Але ў Цюмені, Томску, Калінінградзе, Кемераве, Чыце «не свяціла» кватэра гітарысту з жонкай Лідай і дачкой Марынай. Такі куток знайшоўся толькі ў Мінску: на праспекце, над кінатэатрам «Цэнтральны».

* * *

Я задумаў кінатрылогію: «Песняры. Беларускі цуд», «Песняры. Перарваны палёт» і «Размяняныя Песняры». Здзейсніў, і былі не раз паказаны па тэлебачанні першыя дзве часткі. 29 інтэрв'ю і дзённікі-натакі сведкаў цалкам захоўваюцца ў мяне, адзнятыя на касетах. Нікому не пісаў тэкстаў. Кожны перад камерай быў шчыры: тут і эстрадны Алімп, і анатомія распаду — «праўд» некалькі.

## Частка 1. «ПЕСНЯРЫ». БЕЛАРУСКІ ЦУД

Нараджэнне гурта і пахаване стваральніка падзяляюць 33 гады.

Пасля аўтакатастрофы на Радаўніцу 14 траўня 2002 года Мулявін жыў яшчэ дзевяць месяцаў, і часам здавалася, што ідзе на папраўку. Жонка Святлана і іх сын Валерый прывезлі ў маскоўскую клініку красоўкі, абулі і сцвярджалі, быццам Уладзімір Георгіевіч устаў...

А ўжо йшоў падзел творчай спадчыны! Усе паплечнікі як бы мелі на тое права: і тыя, хто, як Улад Місевіч, былі побач з першых дзён «песняроўства», і тыя, хто стаяў з Мулявіным на сцэне хаця адзін канцэрт. Нават кароткае прабыванне ў «Песнярах» акрэслівала лёс. Акрамя бас-гітарыста першага складу Леаніда Тышко, які цяпер правізар у Ізраілі, ніхто не пазбегнуў магіі гэтага звання. Паўсотні іншых музыкантаў упарта і ганарліва чапляюцца за яго: «Я — „пясняр“, і ніхто іншы».

* * *

Мастацтвазнаўца Барыс Крэпак, сусед Мулявіных, часцяком з дазволу У.Г. уключаў дыктафон у іх бяседах.

***Голас Мулявіна:*** Пачаў займацца музыкай гадоў з 11–12. У 16 год меў прафесію. Кар'ера была непасрэдна

звязана з музыкай. Карані з 63 года ў Беларусі: з лютага быў прыняты ў філармонію. Жонка У.Г. Лідзія Кармальская працавала ў зніклым цяпер жанры – мастацкі гвізд.

*Улад Місевіч* (з. а. БССР, у «Песнярах» у 1969–92 і з 1998 г.): Ліда сфарміравала Валодзю як мужчыну. У яе былі воля і розум. Астатнія дзве ягоныя жонкі «не дацягвалі». Роля апошняй жонкі – самая ракавая.

*Голас Мулявіна:* (н.а. РБ, кіраўнік «АБ»): Я ведаю Валодзю, калі яшчэ разам служылі ў войску. Ён на гітары такія акорды браў! Я імкнуўся наблізіцца, займець ад яго нешта новае. Не адразу, але адкрываў, паказваў.

*Генадзь Старыкаў* (гітарыст): Іграў ён на танцах у ДК Камвольнага: сапраўдны лідар, сакратаўскі лоб! Іграў «Палёт чмяля» Рымскага-Корсакава. Я быў зачараваны нейкай аўрай вакол яго.

* * *

Пасля арміі, у 67-м, Мулявін вярнуўся ў філармонію, іграў у гурце «Арбіта-67», які акампаніраваў Н. Багуслаўскай.

*Нэлі Багуслаўская* (з. а. БССР): «Валодзя, ты – Му-лявін!» – гэта Ліда паўтарала яму настойліва, прымушала займацца пры якіх заўгодна абставінах. І ён браў у рукі гітару. Усе побытавыя клопаты Ліда ўзяла на сябе, не дазваляла несці чамадан. Яго рукі – галоўнае багацце прафесіянала-музыканта.

*Марына* (дачка У. Г.): Мама агараджала яго ад усяго побытавага. Ведала: галоўнае для бацькі – творчасць.

Ва ўспамінах апісваецца, як ён упершыню «палаў голас».

*Нэлі Багуслаўская:* На рэпетыцыі песні «Вдоль по улице» спатрэбілася, каб мне нехта з мужчын падпеў: «Ты постой, постой, красавица моя!» Ніхто не рашыўся. І вось у патрэбным месцы пачуўся чысты

мужчынскі голас. Я азірнулася: «Валодзька — ты?!» Стаіць, пасміхаецца: «Табе ж спяваць патрэбна!» Ён стаў кожнаму прапаноўваць узяць адпаведную ноту. Выбудоўваўся акорд, і ён то зніжаў яго да піянісіма, то давадзіў да мацнейшага фортэ. Музыкантам падабалася іхняе гучанне, на рэпетыцыях сталі шукаць нешта па-за межамі маёй праграмы. Наша сумесная творчасць заканчвалася.

Тыя, хто пайшоў за Мулявіным, далучыліся да жаночага танцгурта «Лявоніха», а таму назвалі сябе «Лявонамі», нават песеньку «фірменную» склалі. Па вечарах ігралі на танцах — збіралі грошы на інструменты, радыёапаратуру, мікрафоны.

Лідар шукаў музыкантаў — лепшых у Мінску, зацікавіўся беларускім фальклорам, намацваў напрамак, нікем раней не адкрыты.

* * *

*Вячаслаў Шарапаў* (кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля «Песняры»): Ствараў Мулявін калектыў па прынцыпе «вясёлкі»: у кожнага ў аўдыторыі павінен быць на сцэне свой фаварыт. Але ў цэлым — вясёлка, поўнакаляровая карціна.

Сапраўды, У.М. кожнаму даваў яго «фірменную» песню, улічваючы індывідуальнасць: Барткевічу — «Александрыну», Дайнэку — «Белавежскую пушчу», Дзямешку — «Забалела галованька», Пеню — «Марысю», Кашапараву — «Волагду».

Для тых, першых, ён быў проста Муля. Мянушкі мелі ўсе. Барткевіч — Александрына, ён быў заўважаны ў студэнцкім гурце будаўнікоў.

*Леанід Барткевіч* (з.а. БССР, у «Песнярах» — 1969—1980 г.): Я працую за кульманам. У прыадчыненых дзвярах галава Мулявіна: «Вас можна на хвілінку?» Зайшлі па суседству ў клас кансерваторыі. Ён мяне паслухаў, а

на другі дзень прынёс «Александрыну». Яшчэ праз два дні — Масква, Калонная зала Дома Саюзаў, творчы вечар Петруся Броўкі. Спеў «Александрыну» — мая першая песня, яна і засталася самай любімай.

*Валянцін Бадзяраў* (гітарыст і скрыпач 1-га складу, Бэдзя): Мяне пасля кансерваторыі размеркавалі ў аркестр театра Музкамедыі, канцэртмайстрам. А ўжо была дамоўленасць з Муляй. Ён прыйшоў з Яшкіным да рэктара, паказалі свае вусы — і выдрапалі мяне. Удзячны лёсу, што трапіў у «Лявоны».

*Голас Мулявіна:* Валерый, мой брат, старэйшы на 2 гады. Я навучыў яго іграць на гітары. І вакал — мой голас, толькі вышэй. Я рыхтаваў яго сола — займаўся, праз паўгода ён бы ў мяне спяваў, стаў бы добрым салістам...

Валерый — з першага складу гурта. У.Г., узгадваючы брата праз чвэрць стагоддзя, гаворыць «бы»: Спяваў бы, быў бы... Сумуе аб неадбыўшымся.

Валерый Яшкін з Рагачова ў «Песнярах» з пачатку (1969—77 гг.), далучаўся да сяброў і пазней, па выпадку. Не вельмі віртуозны клавішнік, але яго можна лічыць ідэолагам гурта. Пасля заканчэння ГІТІСа ў падручніку па эстрадным майстэрстве параўноўваў сваіх з «Бітламі», пісаў:

> «Лявоны» ўзначалілі напрамак з імем «фальклорны біт», калі ў аснову твора кладзецца народная песня (у адпаведнай апрацоўцы) з актывізацыяй рытмічнай асновы.

* * *

Пашыраючы магчымасці гурта, лідар патрабаваў дадатковых уменняў. Паплечніка-армейца, саксафаніста Уладзіслава Місевіча — мянушка Змей — прывучыў да флейты і дудачкі. Кантрабасісту Леаніду Тышко — мянушка Пахмурны — загадаў узяцца за бас-гітару. Новы інструмент павінен быў засвоіць і брат Валерый.

***Голас У.М.:*** Кажу яму: «Слухай, мне труба патрэбна». Ён: «Добра, я навучуся». Праз месяц ён іграў сваю партыю.

***В. Бадзяраў:*** Усю энергію аддаваў скрыпцы, але — захопленасць джазам! — і таму марыў пра гітару. Мулявін даў сваю славутую белую гітару. У час канцэртаў я ставіў крэсла за кулісы і глядзеў на ягоную пальцоўку: як «абыходзіўся» з гітарай.

***Анатоль Ярмоленка*** (н.а. РБ, кіраўнік гурта «Сябры»): Усе тады пераймалі манеру іх ігры. Напрыклад, Бадзяраў часам ускідваў гітару вертыкальна — і мы пераймалі.

* * *

У 70-м годзе першую праграму паказалі мастацкаму савету філармоніі. Здзівіла, што ўсе ігралі і пры тым спявалі! Вырашылі: крыху пагаліць доўгавалосых і вусатых ды рызыкнуць паслаць іх на Усесаюзны конкурс эстрады. За чатыры гады да таго там ужо адбыўся «беларускі прарыў»: Віктар Вуячыч тады заняў 1-е месца, пакінуўшы І. Кабзона на другім, лаўрэатам стала і Н. Багуслаўская.

Хлопцам загадана перайменавацца: як жа ехаць у Маскву «Лявонам» — Лёнькам! — калі краінай кіруе іх аднайменнік Леанід Ільіч. У пошуках назвы кінуліся ў бібліятэкі.

***Леанід Тышко*** (з.а. БССР, гітарыст, у гурце ў 1969-81 гг.): «Лявоны», кажуць, несур'ёзна, блазны нейкія. Знайшлі з Місевічам у Купалы і Коласа: «песняры». Спадабалася нашым хлопцам. Ну, «Песняры» — так і пайшло.

Мулявін неахвотна змяніў назву гурта: перад Масквой гаварыў мне, што верне былое.

***Голас У.М.:*** Людзі проста рагаталі ад тае назвы, бо не ведалі: што за слова такое? Першы раз, калі нас аб'явілі на конкурсе ў Маскве ў 70-м, мы не адразу ўцямілі, што гэта аб'явілі нас.

Але пасля конкурсу на іх абвалілася нячутная слава — і гэта была слава ўжо менавіта «Песняроў»!

І вось васьмярым хлопцам набыты квіткі на цягнік «Мінск—Масква», выпісаны камандзіроўкі з 5 па 15 кастрычніка, выдадзены «сутачныя» з разліка 2 рублі 60 капеек на дзень — тады крыху меней кошту бутэлькі гарэлкі. Але новаспечаныя «песняры» наадрэз адмовіліся галіцца! Тут змірыліся: спадзяваліся, што ў Маскве-та прымусяць зрабіць тое «беларускіх Бітлаў» — так ужо іх сталі называць.

Але ў сталіцы, скораныя майстэрствам гурта, вырашылі, што доўгія валасы і вусы — народныя прыкметы беларуса.

> ***В. Яшкін:*** Перад гледачамі прадсталі хлопцы-зухі, падобныя на вясковых продкаў: вясёлыя, з веданнем свайго кошту.
>
> ***Анатоль Кашапараў*** (з.а. БССР, у гурце ў 1971—90 гг.): Да, Лёня Тышко з такімі шыкоўнымі вусамі — прыгажун! Ды і ўсе астатнія. Я таксама... І па сяе не галю вусы і бародку — так і нашу.
>
> ***Л. Барткевіч:*** Валодзя — тыповы бульбаш: наш беларускі лысаваты мужык. Па тым свет пазнаваў нас: гэта быў твар Беларусі.

«Песняроўцы» ганарыліся, што «бітл» Джордж Харысан выглядае «на беларускі капыл».

> ***Уладзімір Ткачэнка*** (з.а. БССР, скрыпач, гітарыст, аранжыроўшчык, у гурце ў 1977—85 гг.): З «Песнярамі» з'явіліся апрацоўкі беларускіх песень — стрыжань, на якім усё трымалася. «Касіў Ясь канюшыну» ў Расіі не разумелі, але — падабалася!

* * *

**Сенсацыя! Рашэнне журы:**

**Сярод вакалістаў Дыплом, 2-я прэмія і званне лаўрэата IV Усесаюзнага конкурса артыстаў эстрады прысуджаецца Лешчанку Льву Валяр'янавічу.**

Дыплом, 2-я прэмія і званне лаўрэата прысуджаецца гурту «Песняры».

Старшыня журы Леанід Уцёсаў,
сябры: Рашыд Бейбутаў, Ірма Яунзэм,
Аруцюн Акапян...
13 кастрычніка 1970 года.

«Песняры» ў адзін дзень сталі ўлюбёнцамі мільёнаў.

***Ігар Лучанок*** (н.а. СССР, кампазітар): Ніводны расійскі гурт да іх так не перамагаў! Ды й пасля.
І вось што цікава: 1-ю прэмію журы чамусьці не прысудзіла анікому. Магчыма, былі ў разгубленасці: стала ж відавочна, што найвышэйшае майстэрства і бездакорны густ «Песняроў» прымусяць прызнаць і ўзаконіць у СССР гэты жанр.

***В. Шарапаў:*** Нічога лепшага, чым ВІА — вакальна-інструментальныя ансамблі — савецкае эстраднае мастацтва не прыдумала. Па сумме энергетыкі і любові гледачоў — толькі ВІА!

***Голас У.М.:*** Усесаюзны конкурс эстрады — першая ўзнагарода нашага калектыву, першая мара, якая збылася. Маленькая ўзнагарода, але самая каштоўная.

***А. Ярмоленка:*** Усе спявалі тады «камсамольскія песні». А ён прарваў гэтую сцяну! Усе брынчалі на гітарах, а ён зрабіў жанр афіцыяльна прызнаным.

Новыя куміры — беларуская «адметная васьмёрка»: Уладзімір і Валерый Мулявіны, Леанід Тышко, Валянцін Бадзяраў, Уладзіслаў Місевіч, Аляксандр Дзямешка, Валерый Яшкін і Леанард Барткевіч. Чацвярых сёння ўжо няма...

* * *

У кастрычніку 70-га — першая перамога, а ўжо ў студзені 71-га здымкі на «Беларусьфільме». У перапынку з майго дазволу запрасілі У.М. у групу «Міравы

хлопец». Ён вярнуўся з нотнай паперкай, кажа: «Вось далі мне песню да фільма — аранжыраваць трэба і выканаць». — «А як песня называецца?» А ён: «Я нават не глянуў... Вось: „Бярозавы сок“». І праз некалькі дзён «Песняры» запісалі яе. Фільм той забыты, а песня — жыве.

Параўноўвалі наш гурт з «Бітлз», адзначалі: ангельцы пяюць на тры галасы, а нашы — на восем. Наш гурт нарадзіўся, калі той ужо разваліўся. Але і «Песняры» дакладна паўтарылі лёс ліверпульскай чацвёркі: тыя ж сваркі, амбіцыі, падзел, дурныя схільнасці і... смерці.

Да першай трагедыі ў «Песнярах» заставалася два з невялікім гады. І час ужо адлічваўся.

* * *

Мулявіны займалі пакойчык у кватэры над кінатэатрам «Цэнтральны», але гэта быў прытулак усіх «песняроў»: пара боханаў хлеба, вядро бульбы, гарбата. Тут жартавалі, рэпеціравалі, планавалі, было, што і клаліся спаць на падлозе — дзверы ў інтэрнат філармоніі наглуха зачыняліся ў палове дванаццатага. Нэлі Багуслаўская ўзгадвае, як яны з Лідай па начах шылі з мяшкоў чахлы для калонак і ўзмацняльнікаў.

«Песняры» задавальнялі ідэолагаў. Хлопцы спявалі пра трубачоў у будзёнаўках, пра прастрэленыя камсамольскія білеты, пра жаўрукоў, што ляцелі на Палессе, пра чылійскага патрыёта-гітарыста Віктара Хару, пра Хатынь і, канешне ж, — безагідны фальклор: Ясі, Касі, Стасі, бабкі-любкі... Тамы з нотамі народных песень былі засвоены. У пошуках новага калавалі па шляхах Палесся

*Георгій Паплаўскі* (графік, акадэмік): Мы кінуліся ў глыбінкі: Любча, Тонеж, Хойнікі. Бачылі куфары з вышыванкамі, з саматканымі строямі. І як па вечарах спяваюць на прысценках бабулькі... Паехалі Лучанок

з Валодзем, прывезлі шмат запісаных на магнітафон напеваў. Гэта быў трамплін для Валодзі і яго калектыву.

***А. Кашапараў:*** Мы, было, на Палессі ставім бутэлечку — і як адкрыюць бабулькі і дзядкі рот! Можа, праз тыдзень іх на свеце не будзе, а — спяваюць так пранікнёна!

***Ігар Пеня*** (з.а. БССР, у гурце з 1980 года): Здаецца, не было такой музычнай спяваючай краіны, як Беларусь, калі б не У.Г. Ён узгадаў беларусам, што яны — беларусы.

***М. Фінберг:*** Ён зрабіў у мастацтве новае, што да таго нікому з беларусаў не ўдавалася зрабіць.

***У. Ткачэнка:*** Мы развівалі нацыянальныя карані. Калі б спявалі, як «Арэра» ці ў стылі амерыканскага кантры, было б тыпова — джазавае шматгалоссе не настолькі своеасаблівае. А «Песняры» — гэта славянскі спеў, якога не чулі ў свеце. Ды й у нас такога не было.

***Г. Паплаўскі:*** Божа не ўсім дае такой шчодрасці, якой надзяліў Мулявіна.

Аб супрацоўніцтве з ім марылі.

***В. Дайнэка*** (скрыпач, вакаліст, у гурце ў 1977—93 і з 1998 гг.): Аднойчы трапіў на іх канцэрт у Палацы спорту — адразу ашаломлены, закаханы! Узгадваю — валасы пачынаюць уздыбліваццa.

***І. Пеня:*** Пачуў па радыё, як Барткевіч спявае «Александрыну», і проста абалдзеў! І ўсе мае мары, усе жаданні: трапіць у гэты гурт.

Радыёстанцыі завальвалі заяўкамі: «Дайце „Песняроў“!» Іх першыя дыскі, ледзь паступіўшы ў продаж, адразу рабіліся дэфіцытам.

***Л. Барткевіч:*** З 70-га па 80-ты — нашы самыя залатыя гады. Тады можна было прыехаць у горад і 2—3 канцэрты ў дзень даваць — сядзелі ў тым горадзе, пакуль усе жадаючыя не паслухаюць нас. Аншлагі! Можна было і

дзесяць дзён сядзець! Першы канцэрт скончыўся — тут жа рэпетыцыя, прыносілі бутэрброды, нешта на перакус — і зноў на сцэну.

* * *

Беларускі гурт — абавязковы ўдзельнік усіх урачыстых канцэртаў у рэспубліцы і ў Маскве. Яны — яскравы прыклад росквіту нацыянальнага мастацтва. Ім дазваляюць прымаць некаторыя — з адборам! — запрашэнні гастраляваць за мяжой, усяго будуць 64 паездкі.

*Голас У.М.:* У 75—76 гады мы па апросу прэсы былі на другім месцы, уступаючы «АББА». Па настаянні французскага боку нас запрасілі ў Каны.

Іх папярэдзілі: у зале прадстаўнікі фірм гуказапісу з усяго свету, таму апладысментаў не чакайце, а спявайце далей па праграме.

*А. Кашапараў:* Каны... Мы як далі там, як далі «Рэчаньку» акапэльна — тады маглі! Яны там ашалелі!
*Голас У.М.:* Мы атрымалі адразу 23 замежныя прапановы: Ізраіль, Італія, Германія. Еўрапейцы сказалі: «Ішла прамая трансляцыя, калектыў ужо ведаюць — дык, давайце, адразу ў цягнік і на гастролі!» Але ў нас з афармленнем было цяжка, павінны былі вярнуцца.
*А. Кашапараў:* Зараз выхваляюцца: у Амерыцы гастролі Лявонцьева, Пугачовай... Ды ерунда гэта: спяваюць у рэстаранах для тамтэйшых рускіх — я там жыву, я ведаю! Вось мы тады прайшлі ў Амерыцы — гэта да-а! Вялізныя залы, аншлагі, гастролі па Штатах!

І ў самога У.М. надзейны тыл і — росквіт творчасці.

*Н. Багуслаўская:* Ліда рыхтавала яго да славы, адмятала ўсё, што магло адцягнуць яго ад творчасці, пашкодзіць, бо лепей за яе ніхто не ведаў, які ён таленавіты, як адо-

раны Богам! Паўтарала: «Валодзя, ты — Му-ля-він!» І ён паслухмяна садзіўся займацца. Яна стварала яго будучыню сваімі рукамі. Нават думаю, што, калі б не Ліда, усяго, што звязана з легендарным імем Уладзіміра Мулявіна, папросту магло б і не быць.

Ён рыецца ў выданнях старажытнай паэзіі, шмат сачыняе, аранжыруе, нешта апрацаваць даручае Бадзяраву, уключае ў рэпрертуар новыя песні Лучанка. Заўсёды патрабаванне адно: высокая паэзія.

***М. Фінберг:*** Мой аркестр выконвае некалькі яго аўтарскіх твораў. Гэта створана сапраўдным майстрам: сапраўдны ўступ, сапраўдная форма твора, у патрэбным месцы дакладна ўступае пройгрыш, дакладная мадуляцыя, дакладная кода — тое, аб чым сёння ў песні ніхто не думае. І заўсёды — бездакорны тэкст!

***Голас У.М.:*** Мне добрую кніжку прынеслі. — Якую? — «Новая зямля» Якуба Коласа.

Купала, Колас, Танк, Куляшоў, Броўка, Макаль, Валошын, Маякоўскі, Тарас — заўважце: ніводнага прозвішча паэтаў-песеннікаў.

* * *

Гляджу на апошні фотаздымак, дзе яны яшчэ ўсе... І вось: першы пралом, першая страта аднаго з «адметнай васьмёркі». Што можа быць жудасней смерці? Можа, здрада. Але і гэтага, як выслетліцца пазней, У.М. не пазбегнуць.

Летам 1973-га падчас гастроляў у Ялце быў забіты Валерый Мулявін. Цела знайшлі на прыступках да прерасохлага ручая. Загадкавае забойства не выкрылі. Лічыцца, што музыканта прайгралі ў карты крымінальнікі. Хаця, сведчыў У.М., характар у Валеры быў задзірысты.

Неабачлівыя размовы з іншаземцамі ў рэжымным гатэлі «Інтурыст», што магло зрабіць калектыў «невы-

язным», нарастаючыя творчыя разыходжанні — і ў тым жа годзе пакідае гурт Бадзяраў, на той час адзіны «пяснияр» з кансерваторскай адукацыяй. Усё менш цікавым бачылася яму тое, што рабіў Мулявін.

*В. Бадзяраў:* Ніколі не бачыў у яго партытуры. Аднойчы на трох лінейках натаваў: «Ты мне вясною прыснілася». Усё было ў яго ў галаве, мы вывучвалі галасы «з голаса». А партытур не было.

І новая праблема: адышоў на вучобу Валерый Яшкін, уваслед — асноўны вакаліст.

*Л. Барткевіч:* Я заўсёды марыў мець тэатральную адукацыю. Паступіў у ГІТІС на рэжысёрскі, усе тры «пяцёркі» атрымаў па спецыяльнасці. А Мулявін: «Глядзі, выбірай: ці інстытут, ці „Песняры“». І я выбраў ГІТІС.

У Мулявіна змены і ў асабістым жыцці.

*Н. Багуслаўская:* У перадсмяротнай размове маці паспела папрасіць свайго славутага сына: «Ніколі не крыўдзі Ліду, беражы. А калі пакрыўдзіш, ведай, што пакрыўдзіў не яе, а мяне». Ён вельмі любіў маці. Але наказу яе не стрымаў.

У.М. пакінуў Ліду Кармальскую з дачкой Марынай і трохмесячным сынком, названым у яго гонар Валодзем. Хлопчык, падрастаючы, усё больш будзе падобны на бацьку. Мулявін узяў шлюб са Святланай Слізкай, якая нарадзіла яму дачку Вольгу. Другі шлюб ён не лічыў удалым, суджэнне У.М. аб гэтым — у кнізе «Владимир Мулявин. Нота судьбы».

* * *

Напярэдадні 60-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Палацы спорту на працягу тыдня ішлі канцэрты «Песняроў». Гледачы апладзіравалі, але ўсплывала

недаўменне: замест чакаемых песенек ім прапанавалі рок-оперу «Песня пра долю». А яшчэ заўважылі, што склад гурта прыкметна адноўлены. Ваенных музыкаў і рэстаранных лабухаў пацяснілі «кансерваторцы».

***Г. Старыкаў:*** Прайшло 10 год, Мулявін засумаваў. І таму запрасіў выдатных інструменталістаў: Аркадзя Эскіна – піяніста сусветнага ўзроўню, Ткачэнку, Бернштэйна, Дайнэку, Паліводу. Ён паспрабаваў увайсці ў раку ў другі раз.

І адбылася ў тым жа годзе яшчэ адна сустрэча – выпадковая, але ў будучым яна акрэсліла не толькі жыццё Мулявіна, але і вызначыла лёс «Песняроў». У калідоры «Масфільма» яго пазнаёмілі з актрысай



*1971 год*

Святланай Пенкінай. Аказалася зямлячкай, з Гродна. Пажадалі творчых поспехаў і развіталіся. Разышліся, каб праз тры гады сустрэцца і ажаніцца.

А перад калектывам дылема: засвайваць і надалей буйныя формы — пасля «Песні пра долю» ў працы вакальна-сімфанічная рок-араторыя «Гусляр» паводле Купалы з музыкай Лучанка — ці ж звычна развучваць песенькі. Жорсткія спрэчкі ў калектыве мелі падставу: «Гусляра» развучвалі тры месяцы па 12 гадзін запар, а ноты «Волагды» знайшлі выпадкова ў старым зборніку, раскідалі на галасы літаральна перад канцэртам, і яна імгненна стала самай папулярнай песняй ва ўсёй агромністай краіне! Пры першым жа выкананні ў Калоннай зале Дома Саюзаў бісіравалі яе тройчы, чаго не прыпомніць зала, прызначаная выключна для ўрадавых канцэртаў і паніхід па правадырах. І гэта пры прамой трансляцыі па ТБ на ўвесь СССР!

***У. Ткачэнка:*** З «Волагдай» звязана маё першае агарчэнне ў «Песнярах». Песню чуў, круцілі яе ў тралейбусах, але і ў думках не было, што гэта «Песняры». Тры месяцы вучылі «Гусляра», здолелі. І вось у 77-м я ў «Песнярах», першыя гастролі, 1-е аддзяленне — сур'ёзны твор «Гусляр». У 2-м аддзяленні я не заняты. І вось яскончылася і на біс — «Волагда»! Мяне пранізвае: як не здагадаўся, што гэта — «Песняры»?! Здзіўленне, непрыемны сурпрыз, удар нават нейкі.
***І. Пеня:*** Заняліся вялікімі формамі, забылі пра песню. А менавіта ж песні прынеслі нам папулярнасць.

Рана адышоў з жыцця Ігар Палівода, пакінуўшы дзённікі, якія дазволілі ўжыць у фільме ягоны бацька Ігар Пятровіч і жонка Вольга.

***І. Палівода*** (кампазітар, клавішнік, у гурце ў 1978—84 і 1988—89 гг.): Канцэртная зала «Кастрычніцкая», ленінградцы сустракаюць нас, пасланцаў брацкай Бе-

ларусі, з цяплом і ўдзячнасцю. Асабліва кранаюць патрабавальна-ўмольныя ўскрыкі: «„Во-лаг-ду“! „Волагду“ давай!» Гэтыя хвіліны цудоўныя!

Праслаўлены «Волагдай» Анатоль Кашапараў быў і галоўным выканаўцам у рок-оперы «Песня пра долю».

***А. Кашапараў:*** Песні «Крык птушкі», «Малітва», «Перапёлачка», «Сізы голуб» – разгорнутыя сачыненні. Гэтыя балады ўжо як пераход да буйных формаў, якія, канешне ж, узнімаюць калектыў. І песні павінны быць, і буйныя творы.

* * *

З першага складу побач з лідарам засталіся ўжо толькі Улад Місевіч, Шура Дзямешка і Леанід Тышко. Кансерваторскае папаўненне спрабуе заявіць сябе ў больш складанай музыцы, магчыма з элементамі хард-рока, джаза.

***Г. Старыкаў:*** Але сказалі ў Маскве на Цэнтральным тэлебачанні: У.Г., не займайцеся тым, дзе вы не самы сільны. Займайцеся тым, што робіце лепей за іншых. І ён паціху вярнуўся да «мэйстрыму» – галоўнаму напрамку «песняроўскаму».

Але вось і барабаншчык-жартаўнік, верны Шурык, пакінуў гурт. Ва ўзбуйнелым калектыве амбіцыі, адсутнасць дысцыпліны, багемнасць, творчая рэўнасць, выпіўкі, нервовасць у пошуку новых форм і напрамкаў, творчыя тупікі. Бацылла распаду, які грымне ў 90-х, крылася ўжо задоўга да таго.

***Голас У.М.:*** Апатыя пачынае падступаць, перыядычна. Не дазваляю ўдавацца гэтаму пачуццю ў свой арганізм, кірую гэтым пакуль.

Ужо не было побач Ліды, ніхто не падбадзёрваў, не ўнушаў: «Памятай: ты – Му-ля-він!»

*М. Мулявіна:* Калі маці хавалі, бацька сказаў: «Такіх жанчын не кідаюць».

*І. Палівода:* «Песняры» — яшчэ нядаўна флагман савецкай эстрады — сталі здавацца кузюрынкавай мелкаводнай пасудзінай, якая згубіла кіраванне. Бязмоцным стаў капітан, губляе энергію каманда. Больш цікава выглядае нават кацер з надпісам «Верасы» і маторны баркас «Сябры».

* * *

У Гродне да бацькоў прыехала Святлана Пенкіна. Яе ўспаміны зняты з магнітафоннай стужкі — запіс Б. Крэпака.

*С.Пенкіна:* «Песняры» былі ў Гродна на гастролях. Кума Таццяна дастала два квіткі на шэсць гадзін. 1-е аддзяленне — калядна-абрадавая праграма. 2-е — песенькі, што народу падабаюцца. Пажадала яшчэ раз паслухаць 1-е аддзяленне. Другі іх канцэрт быў у 9 гадзін. Я звярнулася да Мулявіна як да знаёмага. Калі б праграма так не ўразіла... Словам, звяла нас абрадавая праграма. 18-е лістапада 1980 года штогод святкуем як дзень сустрэчы. За нашым лёсам стаяла музыка.

Праз паўгода яны пабралі шлюб.

*Голас У.М.:* Мяне якая заўгодна хлусня зводзіць з розуму. Дастаткова падманвалі ў жыцці. Шчырасць, адкрытасць — вось тое, што падкупала ў Святлане.

На пытанне: што хацеў бы ў жыцці змяніць, У.М. у запісанай на магнітафон бяседзе адказаў неадназначна.

*Голас У.М.:* Тое-сёе з творчасці. І паправіў бы памылкі, якія зрабіў у асабістым жыцці, асабліва што тычыцца шлюбаў. Ніяк не патлумачу трэці шлюб... Ніяк не патлумачу.

Вось і разумей гэта, як хочаш.

## Частка 2. «ПЕСНЯРЫ». ПЕРАРВАНЫ ПАЛЁТ

Восень 1976 года, Мінск, Палац спорту, прэм'ера гурта «Песняры»: фолк-опера «Песня пра долю» з музыкай У. Мулявіна, лібрэта В. Яшкіна паводле паэмы Янкі Купалы «Адвечная песня».

Дзясятак аматарскіх фота, праграмка ды «плывучы» запіс з канцэрта, зроблены на магнітафон нейкім аматарам з Гомеля – вось усё, чым можна падмацаваць распавед пра некалі шумлівую прэм'еру. Нічога не захавалася! А ўжо ж існаваў відэазапіс. Не здымалі? Ці носьбіт размагніцілі, знішчылі?

І яшчэ незразумеласць: першымі гледачамі сталі масквічы. А да таго прэм'еру тут адмянілі, шасці тысячам мінчукоў вярнулі грошы за квіткі. Тое не мае тлумачэння: Купала ж, Мулявін жа!

* * *

Вусатыя й барадатыя – каго з іх выбіраць на ролю Маці і Нявесты ў фолк-оперы?

***Людміла Ісупава*** (вакалістка, у гурце ў 1976–79 гг.): Было б камічна, калі б мужчына выконваў жаночую ролю. Здаецца, Яшкін узгадаў, што ў «Верасах» дзяўчынка ёсць. Прыехалі да мяне, далі ноты, праслухалі. З першых сваіх нот адчула, што «ўліваюся», матэрыял мой. «Песня пра долю» – адна з лепшых старонак у творчасці Мулявіна. Кожная роля музычна гучала: кантры-рок-стыль! Уладзімір Георгіевіч меў планы майго ўдзелу ў «Песнярах», пачаў уводзіць мяне ў праграму, не толькі ў оперу. Тым больш, я іграла на флейце, з Місевічам у дуэце выконвалі «Явар і каліна». І, натуральна, пела ў гурце. Але... недзе спрацавалі... не мае значэння, што за абставіны.

***А. Кашапараў:*** У нас быў строга мужчынскі калектыў, як у войску, і Людачцы – маладзюткай, прывабнай –

*М. Мулявіна:* Калі маці хавалі, бацька сказаў: «Такіх жанчын не кідаюць».

*І. Палівода:* «Песняры» — яшчэ нядаўна флагман савецкай эстрады — сталі здавацца кузюрынкавай мелкаводнай пасудзінай, якая згубіла кіраванне. Бязмоцным стаў капітан, губляе энергію каманда. Больш цікава выглядае нават кацер з надпісам «Верасы» і маторны баркас «Сябры».

* * *

У Гродне да бацькоў прыехала Святлана Пенкіна. Яе ўспаміны зняты з магнітафоннай стужкі — запіс Б. Крэпака.

*С. Пенкіна:* «Песняры» былі ў Гродна на гастролях. Кума Таццяна дастала два квіткі на шэсць гадзін. 1-е аддзяленне — калядна-абрадавая праграма. 2-е — песенькі, што народу падабаюцца. Пажадала яшчэ раз паслухаць 1-е аддзяленне. Другі іх канцэрт быў у 9 гадзін. Я звярнулася да Мулявіна як да знаёмага. Калі б праграма так не ўразіла... Словам, звяла нас абрадавая праграма. 18-е лістапада 1980 года штогод святкуем як дзень сустрэчы. За нашым лёсам стаяла музыка.

Праз паўгода яны пабралі шлюб.

*Голас У.М.:* Мяне якая заўгодна хлусня зводзіць з розуму. Дастаткова падманвалі ў жыцці. Шчырасць, адкрытасць — вось тое, што падкупала ў Святлане.

На пытанне: што хацеў бы ў жыцці змяніць, У.М. у запісанай на магнітафон бяседзе адказаў неадназначна.

*Голас У.М.:* Тое-сёе з творчасці. І паправіў бы памылкі, якія зрабіў у асабістым жыцці, асабліва што тычыцца шлюбаў. Ніяк не патлумачу трэці шлюб... Ніяк не патлумачу.

Вось і разумей гэта, як хочаш.

## Частка 2. «ПЕСНЯРЫ». ПЕРАРВАНЫ ПАЛЁТ

Восень 1976 года, Мінск, Палац спорту, прэм'ера гурта «Песняры»: фолк-опера «Песня пра долю» з музыкай У. Мулявіна, лібрэта В. Яшкіна паводле паэмы Янкі Купалы «Адвечная песня».

Дзясятак аматарскіх фота, праграмка ды «плывучы» запіс з канцэрта, зроблены на магнітафон нейкім аматарам з Гомеля — вось усё, чым можна падмацаваць распövед пра некалі шумлівую прэм'еру. Нічога не захавалася! А ўжо ж існаваў відэазапіс. Не здымалі? Ці носьбіт размагніцілі, знішчылі?

І яшчэ незразумеласць: першымі гледачамі сталі масквічы. А да таго прэм'еру тут адмянілі, шасці тысячам мінчукоў вярнулі грошы за квіткі. Тое не мае тлумачэння: Купала ж, Мулявін жа!

* * *

Вусатыя й барадатыя — каго з іх выбіраць на ролю Маці і Нявесты ў фолк-оперы?

***Людміла Ісупава*** (вакалістка, у гурце ў 1976–79 гг.): Было б камічна, калі б мужчына выконваў жаночую ролю. Здаецца, Яшкін узгадаў, што ў «Верасах» дзяўчынка ёсць. Прыехалі да мяне, далі ноты, праслухалі. З першых сваіх нот адчула, што «ўліваюся», матэрыял мой. «Песня пра долю» — адна з лепшых старонак у творчасці Мулявіна. Кожная роля музычна гучала: кантры-рок-стыль! Уладзімір Георгіевіч меў планы майго ўдзелу ў «Песнярах», пачаў уводзіць мяне ў праграму, не толькі ў оперу. Тым больш, я іграла на флейце, з Місевічам у дуэце выконвалі «Явар і каліна». І, натуральна, пела ў гурце. Але... недзе спрацавалі... не мае значэння, што за абставіны.

***А. Кашапараў:*** У нас быў строга мужчынскі калектыў, як у войску, і Людачцы — маладзюткай, прывабнай —

нялёгка з намі даводзілася, нялёгка. Асабліва на гастролях.

Свае адносіны з лідарам Ісупава раскрыла ў газетным артыкуле «Я ушла из „Песняров“, потому что не захотела стать женой Мулявина».

* * *

Наступны буйны твор «Песняроў» таксама рок-опера: музыка Ігара Лучанка, асноўнага кампазітара калектыву. Літаратурная аснова — эпічная паэма Купалы «Курган».

***І. Лучанок:*** Буйныя формы — ці фармат для вакальна-інструментальнага гурта? Вось «Гусляр», «Песня пра долю» — нехта крытыкаваў, быў супраць. Але Мулявіна цягнула да буйных формаў.
***Голас Мулявіна:*** Паступова наш гурт стаў «падцягваць» за сабой публіку. Больш складаныя гармоніі, рытмы, кампазіцыі, аранжыроўкі. Калі б «Бітлз» дэбютавалі, напрыклад, адразу альбомам «Клуб самотных сэрцаў», то гарантую: іх бы не прынялі, як заслугоўвалі, калі б не было да таго «Учора», «Каханне не купіш» і гэтак далей. Каб знайсці кантакт з аўдыторыяй, патрэбна пачынаць з дасціпных, зразумелых, душэўна блізкіх чалавеку тэм і музычных вобразаў.

Ваганні У.М. спагадліва ўспрымаў калектыў. У складзе ўжо палова «кансерваторцаў», у іх — свае суджэнні.

***У. Ткачэнка:*** Заўсёды было некалькі скрыпак — струнная група; заўсёды некалькі духавых: сакс, труба, трамбон — гэта медная група. Амаль хор, амаль медная, амаль струнная — гэта склад! Усё было ў «Песнярах» — і творчы патэнцыял не мог быць заціснуты ў просценькіх песеньках! Шматгалоссе — 5—6 галасоў! — для песенек занадта шыкоўна.

Што засмучала: айчынная публіка не адчула, што «Гусляр» быў разлічаны на больш падрыхтаваную аўдыторыю і апярэдзіў свой час. Нават прыхільнікі «Песняроў» не ўспрынялі складанае сімфанічнае сачыненне ў трактоўцы эстраднага гурта. Творчае дасягненне, вартае сусветнага прызнання, у СССР не запісалі на грамплыту. Гэта зрабіла замежная фірма «Багем мюзік». Філігранная адпрацоўка выканання для запісу мела бачныя вынікі.

***У. Ткачэнка:*** Калі вучылі «Гусляра», настолькі добра, прыгожа спявалі ўсё астатняе! Таму што былі ў адметнай творчай форме. А «Волагда» паказвае: які сэнс так плённа надрывацца? Знайдзі песеньку — і на $^{3}/_{15}$ яе: і глядач прыйшоў, і асабліва працаваць ня трэба. «Волагда» на мой погляд забіла жаданне займацца штодзённа, адточваць выканаўчае майстэрства.

У год «Песнярам» выпадала па 350 канцэртаў. Было, што давалі па сем на дзень! А тры выступленні запар і пералёт у іншы горад лічылі музыканты амаль днём адпачынку.

***А. Кашапараў:*** Выступалі на стадыёнах, у спорткомплексах. «Алімпійскі комплекс» у Маскве — 44 тысячы гледачоў! Хто сёння такую залу збярэ?!

А ў артыстаў сціплыя фіксаваныя стаўкі, хаця яны ўтрымлівалі частку філарманічных калектываў, чынавенства ад культуры. Але музыканты стомлены, пік славы дасягнуты, здалося, што можна «расслабіцца». І творчы ўзровень, самапатрабавальнасць пачалі непрыкметна зніжацца. Было, што й прыкметна.

***І. Палівода:*** Рытмічная аснова гурта моцна пакутуе — гэта асабліва прыкметна пры адсутнасці вакальнай.

«Песняры» ўстрасаюць слухача «Гусляром». І калі ў кульмінацыі на сцэну выйшаў асабіста Гусляр, каб выказаць падонку-князю ўсё, што накіпела, той абамлеў разам са сваёй світай. Сівы стары меў такі «стомлены» выгляд, што гуслі валіліся з ягоных рук, шкляныя вочы глядзелі скрозь князя, з душы вырвалася аблачынка гарачай «духмянай» пары. Зарыентаваўшыся, музыкі грымнулі, прыслужнікі хутка некуды ўцягнулі лысага гусляра.

Гэта — першае здарэнне такога роду. Першае... Гусляра іграў сам У.М.

І вось Пахмурны, маласлоўны вастравумец Леанід Тышко — перадапошні з заснавальнікаў гурта — уходзіць ад Мулявіна. У Ізраіль ён эмігрыруе пазней. А пакуль уходзіць «у нікуды», граць у рэстаран. Значыцца, было ўжо нясцерпна, нешта перастала ўстрайваць і яго, нешта насцярожыла.

***Л. Тышко:*** Напявалі Валодзю, што ён «геній». Адсюль мяняюцца адносіны да сяброў, да сябе. А можна было невялікім складам захавацца і рабіць тое, з чаго пачыналі: з простых беларускіх песень.

* * *

Мулявіну, ужо народнаму артысту БССР, фірма гуказапісу «Мелодыя» ўручае «Залаты дыск». Усяго яна выпусціць дзесяць «песняроўскіх» плыт-вінілаў, агульны наклад 12 мільёнаў!

А ў гурце ўжо не засталося паплечнікаў, што мелі права называць яго Муля і нават Валодзя, ужо чуецца толькі «Уладзімір Георгіевіч».

Падбіраецца новы склад, які назавуць «зорным». Хто ўваходзіў у яго? Як У.М. шукаў выдатных выканаўцаў? Кожны раз, прыязджаючы ў Маскву з адноўленым складам, ён здзіўляў знаўцаў: «Адкуль Мулявін бярэ такіх музыкантаў?»

Пасля ўходу Барткевіча патрабаваўся салодкагалосы тэнар. На гастролі ў Сочы прыбылі «Песняры».

***І. Пеня:*** У рэстаран зайшоў У.М. Павячэраў, перадаў: «А можна паслухаць гэтага маладога чалавека з мэтай працы ў „Песнярах"?» У той час трапіць у «Песняры» — усё роўна, што трапіць на Луну. Яны яшчэ раз прыйшлі, паслухалі мяне. «Ну, чакайце, — кажа У.Г., — мы вам дадзім вестку на працягу месяца». Неўзабаве тэлефануюць з Кіева: «Выязджай». І літаральна на наступны дзень я ўжо спяваў з Валерам Дайнэкам, праўда, у мікрафон за кулісамі: касцюма не было. Так здзейснілася мая мара.

***В. Дайнэка:*** Прапаноў было шмат. У «Арсенал» Аляксея Казлова, гаварыў: «Мая музыка табе блізкая». І прапанова ад Георгія Гараняна. Значыцца, нешта магу, калі такія людзі, як ён і Казлоў, звяртаюцца. Але ў краіне, дзе існуюць «Песняры», зрабіць нешта вартае іншае цяжка. Такія, як «Песняры», былі адны. Пасля першага выканання «Белавежскай пушчы» У.Г. паляпаў мяне: «Твой голас належыць народу».

***У. Ткачэнка:*** «Бітлз» і «Песняры» ў музычнай прасторы займаюць найвышэйшае месца. Тыя распаліся, а «Песняры» нарадзіліся: маёй марай было трапіць у гэты гурт. І яна здзейснілася! Другі перыяд — самы моцны склад гурта! І асалода іграць у гэтым складзе і нават гонар!

Побач з Ткачэнкам «кансерваторцы»: скрыпач і бас-гітарыст Барыс Бернштэйн — інтэрв'ю з ім не адбылося, ён у ЗША, — а з клавішнікамі Аркадзем Эскіным і Ігарам Палiводам не сустрэцца ўжо ніколі...

* * *

«Песняры» прывезлі з Гаваны прыз фестывалю «Варадэра-83».

Мулявіны адзначаюць гадавіну сынка Валерыка.

*Л. Барткевіч:* Ён вельмі любіў сваю радзіну, любіў Валерку. А і ўсіх любіў, усім дапамагчы імкнуўся.

***М. Фінберг:*** У.М. дапамагаў сваім музыкантам атрымаць у тыя вельмі цяжкія гады і кватэры, і машыны, вырашаў іншыя іх пытанні. Але яны ад яго ўхадзілі.

Ён сапраўды сардэчна ставіўся да чужых людзей — тое сведчаць многія. Але ад папярэдніх шлюбаў у яго дзве дачкі і сын. А наколькі ўважлівым ён быў да іх? Былая сяброўка назірала за ягоным жыццём ужо дваццаць год.

*Н. Багуслаўская:* Ён жыў у іншым атачэнні, з іншымі жанчынамі, і ніхто не прымушаў яго займацца, не апякаў і не нагадваў, што ён — «Му-ля-він!» Сын Валодзя рос. Бачыў бацьку па тэлевізары, цягнуў да яго ручкі. Але ў бацькі іншая радзіна, іншыя дзеці, а таксама загад: не зносіцца з тымі, хто раней былі ягонай радзінай.

Уладзімір-малодшы стане неблагім музыкантам, па традыцыі запросяць яго ў Дзяржаўны гурт «Песняры». Але затым — турма, дзе ён і памрэ, не надоўга перажыўшы славутага бацьку.

У гурце застой, «кансерваторцы» паглядаюць на дзверы.

*І. Палівода:* Антычны рэпертуар, прыхлопваючы і прытопваючы, а пры тым прыкметна прыхрамваючы, выконваем «Каляду» — надзейны кіёчык-выручальнік. Выглядаем неяк па-старэцку.

* * *

На сутыку 1983—84-га я запусціўся з рэвю «А таксама цырк». Сама назва сведчыла, што акрамя цырка там будзе яшчэ нешта. І было: «Сябры», «Верасы», гурт В. Бадзярава, джаз Міхаіла Фінберга і, канешне ж, «Песняры». Ад іх у фільм увайшлі купалаўская «Марыся» з музыкай У.М. і ў фінале, у цыркавым «шары-вары»,

калі ўсе цыркачы рабілі ў манежы кожны свае трукі, а «песняроўцы» сноўдаліся паміж імі, — «Каляда».

Але быў зняты яшчэ адзін кліп, ізноў жа Купала і У.М.: «І як тут не смяяцца», рашэнне па сяе лічу арыгінальным. У руках музыкантаў былі балванкі, на якіх грымёры ладзяць перукі, раслліннасць на тварах. Кожнага ўзгаданага ў тэксце персанажа чарговы «пясняр» абыгрываў на здымачную камеру. Пры здачы фільма нехта заўважыў, што нейкі вобраз на балванцы нагадвае некага з кіраўнікоў краіны, — як жа: сатыра! І было загадана нумар выразаць. Раззлаваны, я кінуў стужкі з выявай і з фанаграмай у кошык, тым беззваротна згубіўшы для гісторыі выдатную працу. Урок жыцця непрадбачліваму легкадумнаму рэжысёру.

Праўда, праз тры гады фанаграму песні я ўсё ж ужыў у мастацкім фільме «Камедыянт».

* * *

Напачатку 84-га ў паэта Валянціна Тараса пачуўся званок.

*В. Тарас:* «З вамі гаворыць Уладзімір Мулявін. Ведаеце такога? Жадаю з вамі сустрэцца». Я кажу: «Уладзімір Георгіевіч, калі вы хочаце песень, дык іх няма ў мяне». «Справа ў тым, — кажа Мулявін, — што мне трапіла ваша кніжка „Два сшыткі“, я прачытаў».

Высветлілася, што У.М. ужо паклаў на музыку верш з таго зборніка «Вяртанне». Ён прапанаваў Тарасу падабраць вершы і дапісаць новыя для праграмы да 40-годдзя вызвалення Беларусі і да Дня Перамогі ў 1985-м.

*В. Тарас:* Вырашылі з ім: ніякага парада, ніякага фарбавання, фанфар, ніякага звону літаўр. Вайна, якой яна была: суворая, страшная, брудная, смярдзючая. Вось ёсць верш Сямёна Гудзенкі, франтавіка — у яго частка чэрапа была знесена асколкам, і жывы мозг пульсаваў.

Такім чынам ён пражыў яшчэ цэлы год пасля канца вайны і памёр. І вось у яго ёсць такія радкі пра рукапашную:

*...Бой был коротким. А потом*
*Мы пили водку ледяную,*
*И выковыривал ножом*
*Из-под ногтей я кровь чужую.*

Ну, калі праграма была гатова, яе трэба было здаць Міністэрству культуры, афіцыяльнаму заказчыку. Чыноўнікі прычапіліся да Гудзенкі: «Што гэта такое: „выковыривал ножом“? Як гэта можна спяваць? Ну, перарабіце, ну, змягчыце! Гудзенку – абавязкова трэба змягчыць!»

Уладзімір Георгіевіч сказаў: «Па-першае, Гудзенка, можна лічыць, загінуў на полі бою, сканаў ад страшэннай раны. І што, я буду пасля Гудзенкі ўмешвацца, перарабляць радкі, якія былі сапраўды напісаны крывёю, яго ўласнай? А па-другое: я анічога ў гэтай праграме змяняць не буду! Вам не падабаецца – здымайце ўсю праграму!» І мы пайшлі.

Тыдні на два ўсталявалася цішыня: зверху ні загадаў, ні ўказанняў. А гурт актыўна працаваў, шліфаваў песні для вялікага твора «Праз усю вайну». Дарэчы, назва належыць У.М.: ён вышукаў гэты радок у вершы Тараса.

***У. Ткачэнка:*** Ваенная праграма рабілася не на заказ, а ад душы – яна ўстрасае! І гэта – калі народ асабліва і не жадаў ужо слухаць пра вайну: гэта ж сталі назола навязваць, і ўсім абрыдла. А ў нас настолькі было шчыра – людзі плакалі. І нават на сцэне ў першыя канцэрты нам самім цяжка было ўстрымацца ад слёз. Ваенная праграма ў «Песнярах» – самая моцная.

*В. Тарас:* Была прэм'ера ў вялікай залі філармоніі пры аграмаднай колькасці народу. Яшчэ былі жывыя мае сябры Саша Адамовіч, Навум Кіслік... Навум Кіслік – франтавік, Саша Адамовіч, як і я, – партызан. Пайшоў у партызаны амаль такім жа падлеткам, як і я. Яны яшчэ былі жывыя, сядзелі побач са мной. Іх, як і мяне самога, некалькі агаломшвалі дэцыбэлы. Але ўсё ж-такі праграма гэта – яна і іх, і мяне перавярнула: мае погляды, уяўленні аб сучаснай музыцы. «Праз усю вайну...» не таму, што я аўтар сямі песень – мая роля паднача-леная. Там галоўная роля – гэта Мулявін: Мулявін кампазітар, Мулявін выканаўца, Мулявін рэжысёр, Мулявін дырыжор, Мулявін – усё! І тым не менш, я адчуваў натуральнае пачуццё і гонару, і радасці, што я ўдзельнік гэтай праграмы – вяршыні мулявінскай творчасці.

Канешне, іранічны музыкант не мог не ацаніць твор з пасмешачкай.

*І. Палівода:* Дым, ваенізаваная вопратка, лазерныя эфекты – усё гэта не скрашвае, а падкрэслівае ўбогасць намаганняў зморшчаных дзядкоў. Апладзіруюць, адзначаючы ў нас, у выканаўцаў, выдатную для такога старэчага ўзросту памяць, што ўражвае.

А далей ён ужо сур'ёзна.

*І. Палівода:* Чаму можна павучыцца ў Мулявіна – гэта ўменню бачыць у творах самую сэрцавіну. Але яго ніколі не хапала на супадзенне розных інструментаў, гарманічных функцый, колькасці тактаў. А Ткачэнка аранжыроўкі пачынае з дробязяў, з якіх часцяком вызрае нашта непрадказальнае.

Адчуваеце па тэме і па лексіцы супрацьпастаўленне «кансерваторцаў» самавучкам?

*У. Ткачэнка:* Самая лепшая песня праграмы «Кожны чацьвёрты» Ціхана Хрэннікава. Якім чынам, дзе Мулявін яе знайшоў? Працавалі над ёй у творчым уздыме. Настолькі яна гучыць: паліфанічнасць, развіццё на вакале — без налажэння! Кожны дзень спявалі акапэльна, жыўцом. У «Песнярах» усе спявалі свае партыі, усё спалучалася, злівалася гарманічна. Лічыцца, мы — першыя і апошнія выканаўцы.

Касманаўт Уладзімір Кавалёнак узгадваў мне, як на канцэрце раптам вырубілася электрычнасць — і «Песняры» ў поўнай цемры пачалі спяваць акапэльна, у тым ліку і «Кожны чацвёрты».

* * *

Наступная буйная праца У.М. — мюзікл «Ва ўвесь голас» на вершы Маякоўскага. Кампазітар сам прызнаў твор не вельмі ўдалым. Аўтар сцэнарыя — жонка Святлана Пенкіна. Ёмісты збор твораў паэта яна стала вывучаць з апошняга тома, з пісем. Адкрыўшы паэта як тонкага чулага лірыка, яна падабрала і малавядомыя сатырычныя вершы.

Пры здачы праграмы адбыўся казус. Пасля выканання з'едлівай песні «Падліза» міністэрскі чыноўнік спалохана запытаў: «А тэкст залітаваны?» — значыцца, ці маецца штамп Галоўліта — савецкай цэнзуры.

Але... пасыпаўся і гэты, «зорны» склад. Пакідаюць «флагман», які губляе ход, лепшыя музыканты-аранжыроўшчыкі краіны, якія некалі марылі працаваць у гурце: ім з часам стала неяк цеснавата ў фармаце калектыву. Эскін і Ткачэнка ўходзяць у аркестр Фінберга, ад'язджае ў Амерыку Бернштэйн, афіцыйна зварочваецца да кіраўніка Палівода: у яго жаданне ў другі раз паступіць у кансерваторыю — на кампазітарскае аддзяленне. Рэакцю У.М. ён апіша ў дзённіку.

*І. Палівода:* Ім рушыць уласцівая ад нараджэння непрыязь да ўсялякай адукацыі. «Мы „консерваторіев“

не канчалі, але ўсіх паставілі на вушы!» — часцяком гаварываў лідар. Правінцыяльнае бескультур'е, непісьменнасць, мацнейшая манія велічы пажыраюць розум, які, дарэчы, усё радзей загружае сябе працай «во благо», а таму ўсё часцей яго падводзіць.

Яшкіна, Барткевіча, Паліводу адпускаў лідар на вучобу вельмі неахвотна, але катэгарычна. Так жа ўспрыме і заяву выканаўца папулярнейшай «Вологды», якога У.М. вывеў у заслужаныя артысты рэспублікі.

*А. Кашапараў:* Да ўсё неяк адно і тое ж — дваццаць год адпеў, адчуў: хопіць, вучыцца захацеў. Ну, сказаў пра тое Мулявіну, а ён: «Вырашай сам, толькі адразу: ці „Песняры“, ці вучоба». І я пайшоў вучыцца.

*А. Ярмоленка:* Мулявін кожнага з іх раскрываў пасвойму: гарлаў на Кашапарава — я прыходзіў на іх рэпетыцыі, чуў. А людзі незадаволеныя, тым больш, калі на шыю кідаюцца дзяўчаты — «Я, маўляў, таксама нечага варты!» А тут на яго крычаць, як на падлетка. Большасць згубілася з тых, хто ад яго адышоў. А ён іх «зрабіў» і выкарыстоўваў па значнасці.

Некалі рэгент Жыровіцкага кляштара айцец Андрэй (Скробат) знайшоў старую кружэлку з песняй «Кожны чацвёрты», пачуў там царкоўны кант, развучыў з хорам семінарыстаў і запрасіў Мулявіна.

*Айцец Андрэй:* Мы ішлі па Жыровіцкай абіцелі. Паслухмяннікі-манахі пазнавалі яго: кланяліся сціпла, пачціва. А ён быццам не заўважаў. У вачах У.Г. — нічым таго нельга было схаваць! — чытаўся глыбокі сум. Я бачыў перад сабой чалавека проста стомленага. Стомленага смяротна.

* * *

Напачатку вясны 1987 У.Г. разам са Зміцерам Яўтуховічам склалі некалькі песень на вершы Вінцэнта

Дуніна-Марцінкевіча і Янкі Купалы для майго двухсерыйнага фільма «Камедыянт». Адну купалаўскую Валодзя сам і напеў пранікнёна:

*Не карыце мяне,*
*Што так сумна пяю —*
*Я і так ужо на дне*
*Душу змучыў сваю...*

Тут кампазітара цягне да балады, да споведзі, як будзе пазней у «Крыку птушкі» і ў «Малітве» — на верш усё таго ж правідца-пакутніка Купалы.

У апошнім эпізодзе фільма «Калядкі» я пажадаў, каб прыняў удзел увесь гурт. Але Валодзя саслаўся на выпуск праграмы і «адкамандзіраваў» мне Шуру Дзямешку, Валеру Дайнэку і Толю Кашапарава. І вось яны з'явіліся перад камерай загрыміраваныя, у такім выглядзе, што я не адразу іх пазнаў. Кожны сам сабе прыдумаў «вобраз»: Толя па-блазанску размаляваў твар, Шурык падсініў велізарны «фінгал» пад вокам, а Валера ўвогуле вырадзіўся бабай у хустачцы.

Сёння, калі гісторыя «Песняроў» паступова, з цягам часу становіцца гісторыяй, кошт мае кожны кадр, тым больш такі выразны. Вось ужо сапраўды: з іх, траіх, «иных уж нет...» — вясёлага балбатуна Шурыка, а Кашапараў — «далече», у Амерыцы.

У тым жа годзе закрылі наш праект «Гусляр»: Купала, Лучанок, «Песняры» з Мулявіным, балетмайстар Валянцін Елізар'еў... Што ж, 70-я гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі, а тут князі ды стары гусляр — не да іх.

* * *

Афіцыйныя паведамленні 1986 года: Чарнобыльская трагедыя, сотні ахвяр пры аварыях цеплаходаў «Адмірал Нахімаў» і «Аляксандр Сувораў»; тоне цеплаход «Міхаіл Лермантаў», пажар на «Шата Руставелі»;

гіне сухагруз «Палессе»; сталкваюцца два цягнікі, зажыва гараць людзі... «Перабудове» спадарожнічаюць трагічныя падзеі.

Ускладняецца сітуацыя і ў «Песнярах».

З 1994 па 2000 год Міністрам культуры Беларусі быў Аляксандр Уладзіміравіч Сасноўскі.

*А. Сасноўскі:* Быў у краіне нейкі «час без часу»: не толькі мулявінцы, шмат хто аказаўся нікому не патрэбным: заводы, навуковыя ўстановы, творцы. «Песняры» папалі пад гэтую вось «раздачу».

*І. Палівода:* «Песняры» — маленькая мадэль усяго нашага грамадства развітога сацыялізму. Наяўна ўся гамма прыкметаў: і хваробнае цягненне да лычкаў, плакатаў, юбілеяў і медалёў, і ўсеагульнае п'янства, і татальнае бяздзеянне.

*В. Дайнэка:* На жаль, усё часцей працуем без Валодзі. Прыязджаем на канцэрт — ён на сцэну не выходзіць. Ён не працуе, а нам не хапае рэпертуару. Трэба спяваць ягоныя песні, людзі патрабуюць яго — знаёмы твар! Мы проста на выдыху, стала цяжка.

*Барыс Крэпак:* Нашы радзіны былі асабліва блізкія ў сувязі з незапрошаным прыходам «славянскага» Вакха, ад якога Валодзю аднаму, самастойна не заўсёды было лёгка ўбегчы. Пасля выхаду з «піке» дапамогу ён прымаў моўчкі, ніколі ўслых не дзякаваў, але вочы, яго блакітныя вочы, стомленыя і па-дзіцячы вінаватыя, гаварылі больш за якія словы.

Я ўвесь час меў пры сабе магнітафон. Аднойчы — ён у той час не піў анічога, быў «у завязцы» — я ўзяў бутэлечку сухога вінца, папіваю, слухаю яго: пытанне — адказ, пытанне — адказ. Пасля кажу: «Давай цяпер, Валодзя, завізіруй кожную староначку». Ён завізіраваў. Прыйшоў я дамоў, адкрыў, а на палях аркуша напісана ягоным малюткім почыркам: «Як хочацца выпіць!»

*У. Місевіч:* Мы неяк рэгулявалі яго становішча: «Не, Валодзя, у такім стане мы цябе на сцэну не пусцім. Пакуль у такім стане, працаваць не будзеш».

*І. Палівода:* Круцімся вакол дома па вобласці: Клецк, Беразіно, Лошыца, Маладзечна. Райцэнтры не лашчаць зборамі, але «Песняры» ўпарта выхлопваюць, вытопваюць, вывізгваюць — шукаюць свайго слухача.

*В. Дайнэка:* Ён падыйшоў да мяне ў аўтобусе пасля няўдалых гастроляў, сеў побач, запытаў: «Ты, пэўна, адыдзеш, пакінеш гурт?» Я кажу: «Валодзя, калі так будзе працягвацца, — да». Шчыра яму адказаў. А ён: «Я б на тваім месцы таксама б пайшоў».

У планах нашага т/а «Тэлефільм» з года ў год пераносіўся фільм аб «Песнярах», але ім не да здымкаў. Пустыя месцы ў залах, да 90-х яны канчаткова перасталі быць лідарамі савецкай эстрады. Што ж, рэцэпта творчага даўгалецця ніхто яшчэ не вынаходзіў.

*І. Пеня:* Быў застой страшэнны. Шчыра кажучы, творча мы не раслі. І ўжо вельмі доўгі час.

Кампазітар Алег Моўчан быў апошнім музычным кіраўніком гурта пры Мулявіне.

*А. Моўчан:* Вядучыя сусветныя сацыёлагі даўно падлічылі: перыяд піка якога заўгодна эстраднага калектыву — 7 гадоў. Далей — на спад. Гэта не ад нас залежыць: законы жанра такія.

Лёсы «Бітлаў», «АББА» падцвярджаюць тое палажэнне. Ідуць саркастычныя запісы ў нататніку Паліводы.

*І. Палівода:* Нашы адміністратары сцвярджаюць, што паўторны пракат «Песняроў» у Кіеве і Ленінградзе ў бліжэйшыя гады для нас фізічна небяспечны.

І гэта — аб культавым калектыве Краіны Саветаў! Дарэчы, і сама краіна распадаецца: Мулявін і Алег

Янкоўскі становяцца апошнімі народнымі артыстамі СССР.

Развалены кінапракат: апусцелыя кінатэатры занялі пад рэчавыя кірмашы; аганізавалі без гледачоў тэатры, раскалоліся МХАТ, Таганка, Беларускі тэатр оперы і балета.

***І. Пеня:*** Хацелася нешта рабіць, працаваць. І вось мы сабраліся, прыйшлі да яго: Уладзімір Георгіевіч, вы наш кіраўнік, давайце пачнём працаваць нармальна. Таму што час памяняўся.

***І. Палівода:*** Перааранжыроўкі старога хламу – «Ой, рана на Йвана», – цяпер нам застаецца толькі перайменавацца ў «Лявонаў»: напаўпустыя залы і штораз адмены канцэртаў з нагоды «непраданасці» квіткоў. Канцэртаў няма. Рэпетыцый няма. Запісаў няма. Здымак няма. Гастроляў няма. Працы няма. Грошай няма. Нічога няма.

* * *

Адчай і разгубленасць у артыкуле газеты «Известия»: «Вследствие тяжёлой экономической ситуации усилилось негативное воздействие на неё теневой экономики. В стране сложилась чрезвычайная ситуация, которая требует принятия соответствующих мер...» Крызіс выліўся ў ДКСН (рус. ГКЧП), у спробу дзяржаўнага перавароту.

***Г. Старыкаў:*** Мулявін доўга трымаў гурт – першы і другі склады, – як вялікі гурт «Ролінг стоўнз». Калі наступіла «перабудова», выбітыя былі шмат якія апоры. Ён пачаў набіраць моладзь – і ўзнікла дылема: выконваць, як раней, сваю ж вялікую класіку ці збівацца на моладзевыя сучасныя плыні?

У ягоным маналогу зачапіла мяне слова «апора». «Апора» – чыя? «Апора» – гэта хто?

Мае знаёмцы-прыяцелі з «Песняроў» усіх складаў перад камерай былі праўдзівымі, а пасля здым-

кі — шчырымі. Ігар Палівода пісаў для сябе, — можна лічыць, пры выключанай камеры. І ў дзённіку — пра «апору».

***І. Палівода:*** Асоба патрабуе апоры, але апора не вытрымлівае, пачынае хістацца і ператвараецца ў гнілую дрыгву. «Апора» нашага лідара — ёсць дрыгва, якая засасвае ўсё глыбей. Асабістае жыццё неардынарнай асобы вартае спачування. Гаспадар, схаваўшыся з галавой пад бабскі падол, па сутнасці, пусціў нашу справу на самацёк.

Гэтае перараджэнне бачылі ўсе, хто штодзённа быў побач.

***В. Дайнэка:*** Давяраў неаглядна жонцы, а яна, на жаль, не ўсё правільна рабіла. Гэта можна назваць «пачаткам канца» «Песняроў».

***У. Місевіч:*** Яна была ніхто. Але пакуль нас не было, гастралявалі, яна раптам у пасадзе «памочнік мастацкага кіраўніка»: аклад, права размеркавання сродкаў.

***І. Палівода:*** Ачумелая ад уласнай ненасытнасці «кіназорка» — галоўбух і загадчык аддзела Агульнага ідыятызму. Яна зусім ашалела ад даравых тысяч. Загадвала Галаве працаваць толькі напрамую — у кішэню, выключна з кааператывамі. І сума падзялялася толькі ёю — асобна. Родную філармонію яна напрэч выкінула з галавы. Зашапаціліся разбуджаныя юрысконсульты, замяталіся драпежныя судовыя выканаўцы.

***А. Кашапараў:*** Жонку — жанчыну — не апраўдваю. Дзіўна: Мулявін такі жорсткі чалавек, а тут пайшоў на павадзе ў сваёй жонкі. Я сваю жонку да спраў не падпускаю.

***А. Сасноўскі:*** Яна абнаглела. Намячалі гастролі — яна грошы наперад патрабавала. Непамерныя амбіцыі! Усё пытанне — у Святлане Аляксандраўне. Яна, на жаль, падавіла яго як чалавека. Яна выбрала сабе ролю ах-

вяры: вось, маўляў, свой талент прынесла ў ахвяру Мулявіну. Яна яго пагубіла.

***Л. Барткевіч:*** Не Света вінаватая, як лічаць, — проста яны з хлопцамі творча разышліся.

***І. Пеня:*** Ён кахаў яе. І потым, казаў, страшыўся самотнасці. А я кажу яму: «Не страшыцеся самотнасці! Ды вы аберэце шлюб праз 15 хвілін!» Праўда ж: як праспявае ў канцэрце «Крык птушкі», усю залу жанчын можна браць і весці да яго ў нумар.

Энергіі «памочніка мастацкага кіраўніка» хапала на ўсё: дзякуючы эрудыцыі, вышуквала вершы для новых праграм: Меражкоўскі, Валошын, Купала на рускай мове. Яна грыміравала У.Г., артыстычна вяла канцэрты, наглядала за парадкам — у яе, канешне ж, разуменні.

Паступова Святлана Аляксандраўна засяродзіла ў сваіх руках рашэнне абсалютна ўсіх пытанняў. Гэта раздражняла музыкантаў. Былая негалосная «рада старэйшых» (а там мог абмяркоўвацца нават факт прабывання кагосьці ў гурце) сталася цяпер непатрэбная. З суджэннямі былых паплечнікаў У.Г. перастаў лічыцца, давяраючы толькі жонцы. Ва ўсё часцейшых канфліктах адразу безумоўна прымаў яе бок. Ад усіх адчайных і адкрытых заклікаў утаймаваць жонку У.Г. адмахваўся.

У гэты перыяд вёў запісы Барыс Крэпак.

***Б. Крэпак:*** Святлана Пенкіна далёка не падарунак і для людзей, што абкружаюць яе, і для артыстаў гурта «Песняры». Бачна, што прырода адарыла яе моцным уладарным характарам, які часцяком становіцца проста невыносна ўзрыўным. «Энергетычны вампірызм» — так можна азначыць яе сутнасць, і тое я ведаю па сабе... Але як бы не складваліся ўзаемаадносіны Валодзі і Святланы, што б там ні адбывалася ў іх доме, гэта была іх

чыста радзінная справа. Ён кахаў яе, і яна кахала яго — кахала па-свойму: шырока, горача, прагна, эгаістычна, можа быць, неўраўнаважана (хаця, якая можа быць неўраўнаважанасць у каханні?).

Цяжка пярэчыць Барысу, усё так... Але каб гэта не адбівалася б на працы, на існаванні гурта.

З усіх выказванняў перад камерай пра Пенкіну я выкрасліў рэзкія, асабістыя, пакінуў толькі тыя, што ўплывалі, што выраршалі лёс «Песняроў».

Сёння ад яе вобліка лунае нейкі благасны подых: яна за гадзіну нашай бяседы тройчы самааддана хрысцілася — без патрэбы, па дробязным нагодам. І не звязвалася сказанае блізка і доўга ведаўшым яе, што гэта менавіта пра яе. Цяпер Святлана Аляксандраўна дырэктар музея Мулявіна пры Белдзяржфілармоніі. Яна дзейнічае вельмі энергічна ў напрамку, дзе тычыцца яе мужа. У яе багатая лексіка, фармуліроўкі ясныя, жорсткія, суджэнні безапеляцыйныя: толькі «нашы» і «здраднікі».

Хаця, калі выключалася камера, у адзнаках яе ролі ў лёсе гурта я розніцы сярод ўдзельнікаў не заўважыў.

***Вадзім Касэнка*** (вакаліст, у гурце ў 1998–2004): Была, так бы мовіць, рэвалюцыйная сітуацыя, калі вярхі не маглі... нізы не маглі, вярхі не жадалі — не, ці наадварот? Вярхі не хочуць, нізы не могуць, вось! Маса псіхалагічных фактараў, якія паўплывалі на гэты развал.

Словам, «лента Мёбіуса»: ланцуг прычын і следстваў, дзе тое, што здавалася ўсяго натуральным следствам, аказвалася на справе галоўнай прычынай.

Пасля выказвання перад камерай Валерый Скаражонак нешта чыркануў у маім рабочым блакноце. Калі спявак пайшоў, я прачытаў:

*Когда в семейных шумных сварах*
*Жена бывает неправа,*
*Об этом позже в мемуарах*
*Скорбит прозревшая вдова.*

(Игорь Губерман)

***Л. Барткевіч:*** Валодзю загналі. Яму трэба было адпачыць: ён амаль ніколі не адпачываў. А было б: паболей адпачыць, адысціся ад гэтага ўсяго. Потым узяць яшчэ тайм-аўт, азірнуцца... У яго не было часу на гэта.

* * *

Тая ж газета «Известия»:

Обстановка в стране продолжает ухудшаться. Нарушена товарно-денежная сбалансированность — массовый ажиотажный спрос коснулся всех товаров и услуг.

По талонах чалавеку ў месяц выдавалі: 400 грамаў жывёльнай алеі, 250 раслiннай, па 1 кіло мукі, цукру, круп, адну бутэльку гарэлкі — па паўстакана ў суботу пасля лазні, і 8 пачак цыгарэт — па 5,33 цыгарэты ў суткі.

***А. Моўчан:*** Чалавек гатовы ўспрымаць мастацтва і атрымліваць асалоду ад нейкай інтэлектуальнай творчасці, калі ўсё нармальна ў побытавай частцы ягонага жыцця: дах, ежа, праца стабільная. Але калі ў яго гэтага няма, тады не да «вялікага мастацтва».

Тады асалоджваюць слых «Лагодны май», усялякія Жэні, Стасы, Лады, Улады, Насці, якія раптам вынырнулі адно на гэтыя замутнёныя тры-чатыры гады.

Тады ж небачаныя свету «ўнутрыпесняроўскія» разборкі дайшлі да Міністэрства культуры.

***А. Сасноўскі:*** Дзяржава кожнаму калектыву, які яна фінансуе, даводзіла дзяржаўнае заданне: недзе 50—55 канцэртаў у год яны павінны былі даваць. І калі мы

вывучылі геаграфію гастроляў гурта «Песняры», убачылі, што ККД калектыву занадта нізкі. Трэба было тэрмінова імі займацца, нейкім чынам ажывіць перыяд спаду.

***У. Місевіч:*** Афіцыйна ў 42 гады я пайшоў на пенсію як духавік. Пачаў зарабляць «бабкі», выплыў. Са Старыкавым стварылі «Блюз-рок клуб» — гэта на мае «бабкі». Стварылі фонд імя сябе: 10 стыпендый выдзеліў я ў музычны каледж. Сумы значныя.

***В. Дайнэка:*** Міністр культуры кажа: «Валера, знайдзі Улада Місевіча, зрабіце нешта, трэба ратаваць калектыў!» Гэта была яго просьба. Рашаючая просьба.

***А. Сасноўскі:*** Мы рашылі вызваліць Мулявіна ад адміністратыўнай працы, засяродзіўшы ўсе яго магчымасці адно на творчасці.

***У. Місевіч:*** Я пра Валодзю без іроніі кажу: спяваць, іграць, звальняць, прымаць і за ўсё адказваць — адзін чалавек не можа.

12 студзеня 1998 года. У. М. у той дзень споўнілася 57 год.

***А. Моўчан:*** Дзень яго нараджэння, мы ў офісе. І тут Міністр культуры прэзентуе падарунак Уладзіміру Георгіевічу: вызваліць ад пасады дырэктара, пакінуць толькі ў пасадзе мастацкага кіраўніка.

Перад маёй камерай пасмешлівы прыгажун-бландзін, якому самому б блішчэць на сцэне: гэта дырэктар гурта «Песняры», зарэгістраванага ў Маскве, Ігар Свечкін. Мулявін залічыў яго сваім намеснікам па адміністратыўнай частцы. Ігар з 1992 года і да апошніх дзён працы з У.М. узяў на сябе ўсе арганізацыйна-гаспадарчыя клопаты калектыву.

***І. Свечкін:*** Тады Кабзон прыехаў, празнаў пра змяшчэнне Мулявіна з дырэктарства, сказаў: «Што вы робіце?

Як вы паступаеце? У вас усяго-та тых, хто ў эстрадзе, Лучанок і Мулявін – і ўсё! Такіх трэба цаніць, берагчы, люляць!» – Гэта Кабзон сказаў. – «Ні «Самоцветы» – Юра Малікаў, – ні «Цветы», ні «Лейся, песня», ні «Кобза» на Украіне, а толькі Мулявін у гэтым жанры стаў народным артыстам Савецкага Саюза!»

Але Міністэрства прызнчыла дырэктарам гурта «песняра»-заснавальніка Уладзіслава Місевіча.

***В. Дайнэка:*** Усяго за год, што мы так пачалі працаваць, была атрымана найнавейшая апаратура, засвоены выдзеленыя грошы, знойдзена памяшканне.

***У. Місевіч:*** Разам з Міністрам Сасноўскім хадзілі абіраць будынак. Толькі прыгледзім, прыйдзе Валодзя: «Не, мне гэта не падабаецца». Уходзім. Наступны будынак – ізноў: «Мне гэта не падабаецца».

Выдзяленне валюты для набыцця апаратуры сапраўды бачылася цудам. Але тое не было дасягненнем Місевіча. Гэта быў вынік адчайнага, падобнага на крык птушкі, ліста У.М., напісанага годам раней.

***У. Мулявін*** (надрукаванае інтэрв'ю): Пры філармоніі мы былі прыгонным гуртом. Потом, аддзяліўшыся ад філармоніі і стаўшы Дзяржаўным гуртом, сталі кланяцца ўжо Міністэрству культуры. Цярпенне лопнула ў верасні 1997 года, калі ў нас папсаваўся апошні студыйны магнітафон, і я напісаў дзёрзкую запіску ў Міністэрства культуры.

***А. Сасноўскі:*** Каб атрымаць грошы, ёсць пэўная бюракратычная працэдура. У 1997-м 200 тысяч даляраў – астранамічная сума! Мулявін гэтую справу пачаў, а закончылася яна пры Місевічы – чыстае супадзенне, і не мае нічога асабістага ў адносінах да Уладзіміра Георгіевіча.

*Голас Мулявіна:* У нас адносіны з Сасноўскім, калі глядзець візуальна, добрыя. Але я ведаю: мы не сумясцімы па характарах. Мы папросту фальшывім адзін аднаму.
*У. Місевіч:* Сабраліся ў нашым пакоі, гаворым: «Валодзя, хочаш працаваць? Ты — мастацкі кіраўнік. Але адна ўмова працы: ты ў нармальным становішчы. Калі праблемы са здароўем, — а яны ёсць, відавочныя, і ты іх ведаеш, і мы ведаем за 30 год працы, — то папрацуем без цябе, як у апошнія гады 80 % канцэртаў. Так зараз дамовімся: ты будзеш атрымліваць грошы, справа побытавая, жыць трэба ўсім. Ты заслужыў, прывядзі сябе ў парадак, атрымлівай грошы, таму што гэта твой калектыў, і ты аддаў гэтаму жыццё».
*І. Пеня:* Пагаварылі. І ён згадзіўся: «Добра». Мы ўзрадаваліся!
*У. Місевіч:* Але ўсё гэта было ў адсутнасці «мадам», яго жонкі, таму што яна — па яго версіі — была ў перадынфарктным стане і ляжала дома пры смерці. Дамовіліся, па руках. Пытаемся ў яго: А 30-годдзе «Песняроў» будзем ладзіць?» — «Будзем ладзіць». — Усё з усмешкамі, паабдымаліся. Мы выбудавалі план працы, рэпетыцый. Паехалі на гастролі без яго. Тут жа здымкі на ЦТ пасля 15-гадовага перарыву: «Музычны рынг», «Песні года»!
*А. Сасноўскі:* У перспектыве я верыў: яны знойдуць паразуменне між сабой, і ўсё ўвойдзе ў сваю плынь... На жаль, не атрымалася.
*У. Місевіч:* Прыехалі з поспехавых гастроляў, сустракаемся: «Прывет, прывет!» А ён не вітаецца. Я: «Валодзя, здарова!» Ён праходзіць міма: «Няма мяне».
*І. Пеня:* Ён кажа: «Не, хлопцы, мяне гэта не задавальняе». — «Але чаму?!» — «Мяне гэта не задавальняе» — Ну, відавочна, нехта паўплываў... не будзем гаварыць, хто.
*В. Дайнэка:* На пэйджар прыйшло Алегу Аверыну ад Валодзі паведамленне кароткага зместу: «Вось гэтых не

хачу бачыць». Былі пералічаны прозвішчы: мая і Улада. «Астатнія, хто жадае, заставайцеся».
*І. Пеня:* Пасля гэтага мы пайшлі.

Так учыніў артыст, які ў папярэдніх інтэрв'ю перад камерай ускрыкваў: «Я дрыжэў ад шчасця, стоячы на сцэне побач з Мулявіным!» Нешта ж павінна было адбыцца, накіпець, пераламіцца ў Ігары, каб пакінуць свайго куміра.

*У. Місевіч:* За намі ўсталі і ўсе астатнія і таксама пайшлі. Ён: «Пастойце! Спыніцеся!» Але ўсе выйшлі. Так, Мулявін зрабіў з мяне чалавека. Але калі я ўхадзіў, Мулявіна ўжо не было: ні твару, ні агульнай мэты.
*В. Дайнэка:* Уходзячы, я сказаў: «Сёння вы знішчылі гурт „Песняры". Проста. Як назву. Як адзінку».
*А. Сасноўскі:* Яны ўсе падалі заявы. Я іх запрасіў, адбылася нялёгкая размова. Я зразумеў, што кубачак разбіўся, склеіць яго немагчыма. На мой погляд: псіхалагічнае стамленне адзін ад аднаго, столькі часу разам.

Рашуча асудзіў падзел гурта карыфей савецкай эстрады Кабзон.

*І. Кабзон:* Яны рашылі: «А-а, Мулявін перастаў займацца, яму напляваць на нас, у нас канцэртаў мала!» Канцэртаў ва ўсіх было мала. Крызіс жанру, ішла перабудова ў краіне.

Але з Масквы не ўсё было відна, а таму не ўсё магчыма было патлумачыць.

*А. Ярмоленка:* Мулявін вельмі перажываў, калі яго пакінуў асноўны склад. Ва ўсіх свае апраўданні. Але яму нанесена рана: ён іх выхоўваў — і аблом. Гэта зламала яго як творцу.
*І. Свечкін:* Тыя хлопцы — Пеня, Казловіч, Кацікаў, Марусіч, гукарэжысёр Саша Пакроўскі, усе, нават прыбі-

ральшчыцы — працавалі і раптам пакінулі. Для яго гэта быў удар.

*Айцец Андрэй:* Я глядзеў на яго, на ягоныя вочы... У іх, як у кнізе, можна было чытаць. Такі нейкі адсутны позірк, глядзіць міма цябе: быццам размаўляе з табой, а думае пра нешта іншае. Я прыйшоў да высновы: чалавек вельмі пакутуе.

*Голас Мулявіна:* Гэты «развод» я ўспрыняў як Боскую кару. Мы ў маладосці атрымалі шмат шчасця, радасці, але не змаглі гэтым па-сапраўднаму скарыстацца. І тады Бог сказаў: «Я вам даў так многа, вы не скарысталіся — і я вас пакараю».

*М. Фінберг:* Я бачыў яго, калі заставаўся самотным, а так было не раз. Я думаў: навошта яму ўвогуле гэта ўсё патрэбна? Ён — Мулявін! Яму ж дастаткова зрабіць адну невялікую прыгожую афішу з надпісам «Мулявін», узяць у рукі гітару і ехаць апавядаць проста пра гурт і як ён усяго дасягнуў.

Пасля аднаго з канцэртаў у Кіеве У.М. перадалі аркушык з вершам. Тэкстаў заўсёды прапанавалі яму шмат, але гэты «зачапіў». І нарадзілася балада «Крык птушкі». Радкі Юрыя Рыбчынскага бы адлюстроўвалі існуючае: «Я бы простил измену, если бы не любил».

Мулявін застаўся зусім адзін... Дарэчы, не — побач з ім «памочнік мастацкага кіраўніка».

А тыя, хто пакінуў яго, хто апынуўся літаральна на вуліцы, стварылі гурт «Беларускія песняры». І гэта было яшчэ толькі пачаткам дзялення. У некаторыя часы гуртоў з брэндам «Песняры» я налічваў пяць. Толя Кашапараў сцвярджаў, што шэсць.

* * *

14 траўня 2002 года СМІ паведамілі, што на шашы Заслаўе — Калодзішчы, у раёне вёскі Лапаравічы ў аўтакатастрофе пацярпеў народны артыст СССР

Уладзімір Мулявін. Стан здароўя кіраўніка славутага гурта «Песняры», па заключэнні лекараў, вельмі цяжкі.

Але ў інфармацыях ані слова — ды пра тое і не магло гаварыцца! — пра фізічны і душэўны стан У.М. ў той дзень, пра драматычныя падзеі, што папярэднічалі катастрофе.

З свайго лецішча ў Лапаравічах, што на беразе Мінскага мора, ад'ехаў ён апоўдні, каля 12 гадзін. І адразу было містычнае папярэджанне: не трэба ехаць!

Не адчуў голас лёсу? Ці... не паверыў?

У той дзень аўтакатастрофу і што ёй папярэднічала расследаваў старшы лейтэнант ДАІ Канстанцін Янушка. У час здымак, у 2008-м, ён, ужо маёр, прыехаў з маёй здымачнай групай у тую вёску, да выезда з правулка ад лецішча, дакладна і падрабязна ўзнавіў падзеі таго гарэснага дня.

*К. Янушка:* Прыпынілася адна жанчына, суседка, і на маё пытанне адказала, што Мулявін не так даўно адсюль ад'ехаў. І яшчэ яна паказала: вось насып пяска, на якую наехаў яго «Мерседэс», і што ён забуксаваў. Такім чынам, агараджаў яго лёс ад ДТП, папярэджваў не ехаць на тую дарогу і трапіць у гэтую падзею. Сказала, што праязджаў нейкі самазвал, кіроўца якога дапамог выбрацца Мулявіну: ці то буксірам, ці проста штурхануў і даў магчымасць выбрацца з тае кучы пяску.

* * *

І пачалася дзевяцімесячная барацьба за жыццё легендарнага артыста. А за ягонай спінай ужо йшоў падзел «песняроўскага», а па сутнасці, мулявінскага маярата. І склалася так, што нехта з паплечнікаў нават імя нейкага іншага «песняра» чуць не можа, не хоча.

Але я ўсім — усім паасобку і разам — даў выказацца перад камерай.

## Частка 3. РАЗМЯНЯНЫЯ «ПЕСНЯРЫ»

У цягніку па дарозе ў Туапсэ пачуў раніцай па радыё:

Сегодня, 26 января 2003 года, в московской нейрохирургической больнице Института имени академика Бурденко скончался от острой сердечной недостаточности в результате спинномозговой травмы народный артист СССР Владимир Мулявин. Ровно две недели назад легендарному «песняру» исполнилось 62 года.

Адразу міжволі ўзгадалася наша апошняя сустрэча...

* * *

Роўна за два гады да скону У.М., 21 студзеня 2001-га ў Маскве перад неіснуючай цяпер канцэртнай залай «Расія» адбылося адкрыццё памятнай зоркі ў яго гонар, а пасля канцэрт-віншаванне: адзначалася 30-годдзе «Песняроў» — самага славутага эстраднага гурта Савецкага Саюза.

З тае даты й пачнём адлік апошніх 24-х месяцаў жыцця У. Г.

Суправаджаць выступленне гурта прыехалі лепшыя беларускія музыканты.

*М. Фінберг:* Апошнія канцэрты ён правёў менавіта з нашым калектывам: «АБ» — Нацыянальным канцэртным аркестрам Беларусі. Ён з павагай адносіўся да маіх музыкантаў, асабіста да мяне. Ён сам папрасіў, каб я дапамог яму правесці гэтыя канцэрты, і гэта для мяне быў вялікі гонар.

Аднак набольш «падкаваныя» і дапытлівыя гледачы звярнулі ўвагу на факты, што не мелі тлумачэння: юбілей «Песняроў» святкаваўся на два гады пазней — чаму? Чаму на сцэне з музыкантаў славутых былі толькі Кашапараў, што прыляцеў з ЗША, і Бадзяраў, які прыехаў з Нямеччыны, хаця зусім нядаўна ў Ма-

скве выступалі Місевіч, Дайнэка і Пеня? А тых, хто сядзеў бліжэй да сцэны, здзіўлялі надта ўжо памяты твар У.М. і ўвогуле нейкі яго адрэшаны, неадэкватны падзеі выгляд — тое выяўляе неадрэтушаванны здымак, зроблены на папярэдняй рэпетыцыі. Ды й увогуле было неадступнае адчуванне, што адзначалася не 30-годдзе гурта, а 30-годдзе аднае назвы «Песняры».

Але ўсё, аказваецца, мела тлумачэнне.

* * *

«Союз нерушимый республик свободных», у якім нарадзіліся і праславіліся «Песняры», распаўся. Музыкант-вастравумец адзначае тое ў дзённіку.

*І. Палівода:* «Сяброўства народаў» СССР абвастрылася яшчэ болей. Старыя кажуць: «Так вясёла і цікава не было з вайны».

Вось і ядро «Песняроў» пачало, як сказалі б фізікі, «расшчапляцца». Лідар — у крызісе, у роспачы.

*Б. Крэпак:* Памерла яго сястра Наташа. Тэлефануе: «Спускайся, паедзем». Едзем на могілкі выбіраць месца. Ён за рулём, раптам гаворыць: «Мне Ясенін прысвяціў верш. Не смейся, не здзіўляйся, зачытаю:

*Какой скандал! Какой большой скандал!*
*Я очутился в узком промежутке.*
*Ведь я мог дать не то, что дал,*
*Что мне давалось ради шутки.*
*Гитара милая, звени, звени!*
*Сыграй, цыганка, что-нибудь такое,*
*Чтоб я забыл отравленные дни,*
*Не знавшие ни ласки, ни покоя...»*

Я ўдумаўся: усё супадае, нават гітара! Ён не ўсё даў, у яго столькі праектаў было!.. «Атручаныя дні» — два гады жоўтая прэса, былыя сябры, якіх ён зрабіў «песнярамі», аблівалі яго, Святлану.

***М. Фінберг:*** Здрада не ў адданасці кіраўніку, а здрада ў творчасці — самае агіднае.

***У. Місевіч:*** Нейкі час мы былі літаральна на вуліцы. Шурык Дзямешка, нябожчык, тэлефануе: «Давайце, збярэмся, пацаны!» Мы яму кажам: «У Валодзі праблемы, ён не заўсёды можа». А той: «Ды хай сабе: як-небудзь выйдзе на сцэну». Не, кажам, Шурык: у гэтыя гульні мы ўжо гулялі. «А калі без яго?» Тэлефануе з Амерыкі Барткевіч амаль кожную ноч — у іх дзень, у мяне ноч: «Давай збярэмся!»

***В. Дайнэка:*** Лёня Барткевіч з Толем Кашапаравым там, у Амерыцы, заварушыліся. Насцярожвала ў прапановах Лёні: не заўсёды быў цвярозы. Ужо несур'ёзна. А далей гаворыць: «Чаму б нам з „Бітлз" не аб'яднацца? Я з Харысанам кожны дзень бачуся! Майкл Джэксан аббівае парог!» Далей высветліваецца: аказваецца, Спілберг выйграў тэндэр — здымаць фільм пра Мулявіна, пра нас! Вядома ж, насцярожвала: Лёня не ў сабе. Журналістам траві, а нам не трэба.

Тыя, што «адкалоліся», звярнуліся ў Міністэрства юстыцыі і атрымалі дазвол: «Так, вы маеце законнае права называцца „Песнярамі"...»

***У. Місевіч:*** «...таму што ў вас там пяць заслужаных, а Мулявін, хаця і „народны", але ідзе як адна фізічная асоба. Вось, каго больш, тыя і маюць права» — такі нам быў адказ. Але мы на тое не пайшлі, таму што гурт быў — ягонае дзіця. То быў край, які пераступаць нельга. Мы прыдумалі дадатак: «Беларускія». З гэтай паперай прыйшлі ў Дзяржканцэрт. А там: «Ну, калі Мінюст не супраць, мы лічым за гонар мець такі калектыў у сваіх шэрагах!»

***А. Ярмоленка:*** Той, які адкалоўся, самы моцны калектыў: Дайнэка, Місевіч — класныя хлопцы! Але без Мулявіна — гэта не «Песняры». Хай не крыўдзяцца, але ягонай энергетыкі не хапае.

*А. Кашапараў:* «Беларускія песняры» — адзінае, што засталося ад «Песняроў», шматочкі залатога мінулага... там я спяваў дваццаць гадоў.

* * *

*І. Пеня:* Праца пачалася сапраўды творчая! Іскалавалі ўсё, што можна — ад Амерыкі да Францыі! Зараз працавалі разам з Уітні Х'юстан, зрабілі запісы з Тота Кутунья: «Когда весна придёт — не знаю». Мы нясём тую культуру, якую заклаў у нас У.М., — таго, высокага ўзроўню!
*У. Місевіч:* За 15 гадоў застою калектыў згубіўся ў часе. Нас ужо не пазнавалі, цяпер пазнаюць усіх: Кацікава, Аверына на кірмашах, у крамах — першы паказчык! І не толькі ў Мінску, а ў Маскве, у Сібіры!
*Голас Мулявіна:* Гэта яны апраўдваюцца, пруць на мяне. Гэта імітатары. Яны былі заменай Барткевічу і Кашапараву — гэта не тая група.

У Барыса Крэпака дзясяткі касет — запісы шматгадзінных размоў таксама з Туравым, Пташуком. Які ён дальнавідны: разумее, хто стварае гісторыю беларускага мастацтва. Дарэчы, як і ён сам, аўтар шматлікіх кніг, асоба, якая разумее, што ўсе мы — смяротныя.

*Б. Крэпак:* Святлана не заўсёды дазваляла ўключаць магнітафон: тое не трэба запісваць, таго не трэба. Але я запісваў усё і потым даваў яму на візу... А бывае, замкнецца. Маўчун. Аднойчы я запытаў: «Як адносішся да „Беларускіх песняроў"»? — «Да якіх? Упершыню чую».

На самай справе У.М., канешне, добра ведаў, аб кім ішла размова.

*Голас Мулявіна:* Я кажу: заспявай «пад Барткевіча», каб было падобна крышачку. Не атрымлівалася, часам

атрымлівалася. А каштоўнасці яны для мяне — ніякай. За 17 год працы Пеня не адкрыў аніводнай песні! Дайнэка не адкрыў аніводнай песні!

Нельга палемізаваць з тым, каго няма, хто табе не адкажа. Але тут недакладнасці. Валерый Дайнэка першым «адкрыў» песні «Зачараваная», «Я ўсё той жа», «Ад родных ніў», аранжыраваў для сябе народныя «А дзе была вуціца», «Ой, ты, дубе». Ігар Пеня першым выканаў і пяе цудоўную мулявінскую «Марысю». Абодва развучылі партыі і спявалі ў мюзікле «Во весь голос» з музыкай Мулявіна... Дык што, гэта агіда? Ці наўмыснае забыццё?

У шматгадзіных, запісаных Крэпакам прызнаннях У.М. добра адгукнуўся толькі аб тых, хто памёр ці развітаўся з ім вельмі даўно.

Але ж не без падставы пакідалі лепшы ў СССР гурт лепшыя музыканты, у канцы канцоў, — усе. Усе! Нават прыбіральшчыцы, як сведчаць удзельнікі развалу. Але ні на воднай касеце ні аб кім з іх У.М. не адазваўся добра, у развале калектыву аніякіх сваіх і «памочніка» пралікаў не бачыў і — ні слаўца хрысціянскага пакаяння.

*А. Кашапараў:* У царкве, што на Арлоўскай, ён літаральна б'ецца галавой аб мармуровую падлогу. Гляджу: ды ці Мулявін гэта?! Ён такі стрыманы быў, нават суворы, а тут...

*Айцец Андрэй:* Ікона Маці Божай Жыровіцкай... Ён падышоў да яе, хвілін пятнаццаць стаяў. Аб чым размаўляў з Богам, аб чым з Маці Божай гаварыў, гэта таямніца. Я толькі ўбачыў, як чалавек выцер вочы, сказаў: «Калі б я мог у маладосці хаця сотую частку адчуць таго, што адчуваю цяпер, то, можа, маё жыццё пайшло б па-іншаму».

* * *

Перад набліжэннем 30-годдзя гурта У.М. з жонкай паляцеў у ЗША да Барткевіча. Туды ж прыехаў і Кашапараў. Абмяркоўвалі план юбілейнага канцэрта. Анатоль на ўрачыстасць не прыедзе, але прыедзе Бадзяраў.

***В. Бадзяраў:*** Пасля запрашэння я зноў адчуў сябе маладым «песняром». І вось першая сустрэча на рэпетыцыі ў Мінску. У.Г. зайшоў у нейкім адрэшаным стане. З Уладам Місевічам не бачыліся гады паўтара — і гэтак душэўна абдымаемся! А з Мулявіным не бачыліся гадоў дваццаць: «Прывет!» — «Прывет».

Такая сустрэча зрабіла ўражанне... не шакіруючае, а нейкае шчымлівае. Думаў: ён прыйшоў, і пойдзе рэпетыцыя пад яго кіраўніцтвам. Але не здарылася: пахадзіў хвілін дзесяць і знік. Наступнага дня адпраўка ў Маскву. Усе мы страшыліся: як пройдзе момант «выняцця» яго... (уздых) з абдымкаў кватэры? Удалося неяк агарадзіць яго ад непатрэбных нам асоб. Мы страшыліся, што паедзе ў Маскву «ў суправаджэнні». А што паехаў адзін — тое вялікі плюс. Канцэрт прайшоў досыць роўна, Мулявін спяваў вельмі прыстойна. У знак падзякі я паабяцаў яму з яго новым гуртам арганізаваць гастролі ў Германіі.

***Л. Барткевіч:*** Муля сказаў: «Будзеш спяваць „Бярозавы сок“». Думаў, мяне забылі, а людзі пачулі мой голас, падняліся і пачалі апладзіраваць. Я ледзь дапеў, выбег за кулісы, расплакаўся... Усё! Гэта мая радзіма, мая сцэна, мая праца! Больш у Амерыку я не вярнуўся.

Не заставаліся без увагі і «вінаватыя ў расколе»: былі і яны, аказваецца, запрошаны. Але нейкім дзіўным чынам.

***У. Місевіч:*** Мы ў Сібіры на гастролях. За дзень да канцэрта ў Маскве адтуль тэлефануе рэжысёр: «Я ад імя

Мулявіна: тэрмінова вылятайце на заўтрашні канцэрт!» — «Але ў нас планавыя гастролі». — «Вылятайце. Валодзя кліча вас на свой юбілей... на ваш юбілей!» Але мы ж ведаем, што да раніцы Валодзя перакукуе, пераспіць з жонкай, і будзе іншае рашэнне. А гастролі ў нас доўгія, нельга зрываць так паспешна. Катэгарычна нельга.

***В. Дайнэка:*** Ды й запрашэнне было неяк... ускользь.

***У. Місевіч:*** Не можам вырвацца: Краснаярск! Побач гастралюе Кабзон, пытаецца: «Вы едзеце?» — «Нас У.Г. не запрашаў». — «Ну, я паехаў». Але ў яго, аказваецца, усё было запланавана загадзя. Перадавалі нам, што ён на сцэне сказаў: «Валодзя, табе прывітанне з Сібіры ад тваіх хлопцаў — „Беларускіх песняроў“».

***М. Фінберг:*** Калі аб'явілі яго імя, гледачы ўсталі. Яшчэ раз пераканаўся, як яго любілі ў Расіі. Ужо таго гурта «Песняры», на жаль, не было. Але быў Мулявін!

Гледачы, магчыма, пачалі асэнсоўваць, што «Песняры» ператвараліся ў музей васковых постацяў, у блёклы цень саміх сябе. Агідна было б тут цытаваць водгукі аб тым канцэрце: пасмешлівыя, знічтажальныя — публіка жорстка ставіцца да «ападаючых» куміраў. І ні масквічы ў той студзеньскі вечар, ні мы, мінчукі, што ўбачылі той канцэрт у філармоніі двума месяцамі пазней, і падумаць не маглі, што вось так — спяваючым! — бачым Мулявіна ў апошні раз, што гэта — Развітанне.

* * *

На вялікую сцэну У.М. вывеў маладняк. Тут ужо ніхто не звяртаўся да яго на «ты», і тым больш не зваў «Муля».

***У. Місевіч:*** Нам, «Беларускім песнярам», у філармоніі далі пакой побач з пакоем Валодзі. Мы бачылі: хто ў якім стане прыходзіў, і што там яны рабілі. Мы

пераканаліся: адышоўшы, зрабілі правільна, там нічога не мянялася. На жаль, усё засталося, як было.

***В. Шарапаў:*** Я прыйшоў паказаць свае песні Мулявіну і адчуў шок: у такім стане знаходзілася яго студыя! «Залаты дыск» ад фірмы «Мелодыя» валяўся ў куце, каля сметніцы. Усё было неяк недагледжана... У.Г., пэўна, зразумеў у музыцы ўсё, што магчыма было зразумець, і жыццё перастала яго цікавіць у побытавым сэнсе.

***М. Фінберг:*** Ён не мог без калектыву, ён не проста іграў у гурце, ён «думаў» гуртом — кампазітарскае дараванне будавалася на падмурку гурта!

«Будавалася» — так, некалі. Але ў храналогіі творчасці, пачынаючы з 1996 года, няма ўзгадкі не толькі аб буйным творы, але і аб новай песні ці хаця апрацоўцы. Няма.

***А. Кашапараў:*** Мы, шасцёра вакалістаў, спявалі як адзін голас: тут гарлавы, тут насавы. Зараз спяваюць, хто як умее. Былі «Песняры» — і «няма таго, што раньш было».

***У. Ткачэнка:*** Усе цяперашнія «песняроўскія» калектывы проста перапяваюць з нашых запісаў: ніхто з маладых не зносіўся «жыўцом» з Мулявіным.

Галоўны рэдактар газеты «Культура» Людміла Крушынская — суседка і сяброўка Мулявіных — скампанавала кнігу «Уладзімір Мулявін. Нота лёсу».

***Л. Крушынская:*** Незадоўга да тае аўтакатастрфы ён напеў мне дома фрагмент паэмы Ясеніна «Чорны чалавек»:

*Друг мой, друг мой,*
*Я очень и очень болен.*

*Сам не знаю, откуда взялась эта боль.*
*То ли ветер свистит*
*Над безлюдным полем,*
*То ль, как рощу в сентябрь,*
*Осыпает мозги алкоголь...*

Я ўскрыкнула: «Ты што?! Ясенін напісаў гэты рэквіем за месяц да скону ў „Англетэры“! Навошта табе? Нашто?..» Нічога не адказаў.

* * *

***І. Свечкін:*** У 2002-м у траўні ў нас быў вялікі тур па Сібіры. Прыляцелі ў Мінск. Ён пытаецца: «Ігар, колькі ў нас часу вольнага?» Я кажу: «Тыдзянёк. Далей ляцім: Наябрск, Сургут, Новы Урэнгой». — Ну, разбегліся на тыдзянёк. А тут якраз святы: Радаўніца.

Што адбылося ў гэты «тыдзянёк», сведчыць сам У.М., калі праз месяц пасля аўтакатастрофы быў у стане прыгадаць, што адбылося. Прыводжу дакуманты падрабязна, бо нідзе больш акрамя маёй кнігі «Магия многоцветного экрана» пра гэта не прачытаць.

Загадчык архіва абласной ДАІ маёр міліцыі Наталля Драгун дастае тэчку «Дело № 02016000099».

Протокол от 14 июня 2002 года,
начат в 9 часов 45 минут,
окончен в 10 часов 10 минут.
Допрошен потерпевший
Мулявин Владимир Георгиевич.

«С самого утра я приехал к себе на дачу в деревню Лапоровичи. День 14 мая знаменуется тем, что это Радовница, день посещения умерших. Я съездил на могилу к сестре, на Северное кладбище. Ездил один, так как хотел остаться один и посетить могилу сестры. Жена,

помню, предложила, хотела поехать вместе со мной, но я ей отказал. Примерно в 12 часов на автомобиле вновь вернулся на дачу. Звонил ли я кому-либо в тот день по телефону, не помню. Я, вероятно, собирался ехать домой, в город Минск. Чувствовал я себя в тот день хорошо, был бодрый, но слегка поникший. Нахлынули, возможно, какие-то воспоминания. Не могу сказать что-то конкретное.

Я сел за руль автомобиля «Мерседэс-Бенц-420», 01-54 РН и поехал. Выехал, вероятно, на автодорогу Колодищи — Заславль и продолжил движение в направлении Колодищ. Это я помню очень смутно. Что происходило далее, я не помню совсем. Спиртных напитков и препаратов, которые замедляют реакцию, не употреблял. Всё, что я помню по произошедшему, это включённые фары автомобилей — возможно, даже нескольких, — которые шли навстречу и почему-то справа. И мне казалось, что было темно. Как и что происходило дальше, не знаю. Пришёл в себя затем лишь в больнице. Но через сколько дней, не знаю».

Со слов Мулявина В. Г. записано верно.
Допросил: старший лейтенант Янушко.

*К. Янушка:* Калі прыехалі на месца катастрофы, самога Мулявіна ўжо не было. Убачылі проста пакамечаны аўтамабіль. Было не ясна: хто знахадзіўся ў машыне і ці Мулявін там быў?

Запрос па рацыі пацвердзіў: так, то машына Мулявіна.

* * *

Зносіны Валодзі з машынамі былі своеасаблівымі. У двары стаялі «Волга», «Шэўрале» — усе з паломкамі. Ён жартаваў: «Гэта мая нерухомасць».

Увосень 75-га тэлефануе мне ў Гомель Улад Місевіч, кажа ўзрушана: «Муля разбіўся. У нас канцэрт, не-

магчыма сарваць. Ён ляжыць у Пухавічах. Мо, заедзь да яго?» Я з групай вяртаўся з экспедыцыі, спынілі аўтобус.

Валодзя ляжаў у прыдарожным зялёным дамку ФАПе. Твар быў у ранах, некаторы час яго не дазвалялі транспартаваць у Мінск. Побач была другая жонка, Вольга. Убачыўшы мяне, адразу паўсміхаўся, і мы прынялі звычны ў той час між намі, тады маладымі, тон непрымусовай бяседы з жартамі, падколкамі, самаіроніяй.

Упраўленне машынай і пры тым роздум, усхваляванне нечым іншым стануць праз шмат год вытокам апошняй трагедыі.

* * *

На схемах ДТЗ: шаша са схілам і закругленнем, лінія руху сведчыць, што шафёр не справіўся з кіраваннем, машыну вынесла на левую збочыну. Пашчасціла, што не было сустрэчнага транспарту, або быў, але кіроўцы неяк увярнуліся ад сутыку лоб у лоб. Самае трагедыі не бачыў ніхто.

***К. Янушка:*** След юза сведчыў, што хуткасць «Мерседэса» была 110–120 км/гадзіну. Злева аўтамабіль перасек шашу ўпоперак, з'ехаў у правы кювет паміж двума елкамі. У сплюшчанай машыне між дахам і крэсламі было 15–20 сантыметраў. Тэхнічная экспертыза пацвердзіла: аўтамабіль быў абсалютна спраўны.

За шэсць год пасля катастрофы ствол елкі, абадраны «Мерседэсам», заплыў смалой.

Заключэнне таксікалагічнай лабараторыі № 5350 ад 15 траўня 2002 года: «У крыві Мулявіна 1,06 праміле этылавага спірту».

На пытанне: гэта многа?

***К. Янушка*** (паўза, пасмешачка): Радаўніца.

Следства спрабуе ўсё ж дазнацца: чаму У.М. так паводзіў сябе ў светлы вясновы дзень на добра знаёмай яму сухой дарозе.

Заключэнне экспертна-крыміналістычнага цэнтра:

> 14 мая 2002 года в 12 часов 30 минут на 25-м километре автодороги Колодищи — Заславль вблизи деревни Лапоровичи Минского района водитель Мулявин В.Г., управляя автомобилем «Мерседес-Бенц-420», госномер 01-54 PH не справился с управлением, допустил занос, выехал в правый по ходу движения кювет, совершил наезд на придорожное дерево и опрокинулся. В результате ДТП водитель вышеуказанной автомашины получил телесные повреждения. «Мерседес» находится в правом по ходу движения в сторону деревни Колодищи кювете под углом к проезжей части — смотри схему ДТП.

Гляджу на аркуш паперы: дакладная схема, сухі пратакол...

Але ж на 25-м кіламетры ў кювеце валялася не проста пакамечанае жалеза, у якім «отсутствовало жизненное пространство». Там — эпоха, вяршыня савецкай эстрады, слава беларускага мастацтва.

* * *

Заключэнне судова-медыцынскага эксперта:

> Характер телесных повреждений свидетельствует о том, что все они относятся к категории тяжких телесных повреждений, по признаку опасности для жизни.

Гэтую «опасность» наканавана было адвесці адзінаму буйнаму спецыялісту па паталогіі пазваночніка, падцягнутаму і нешматслоўнаму прафесару Іёсіфу Варановічу. За ім у канцы святочнага дня 14 траўня прыслалі машыну.

*І. Варановіч:* Мулявін у найцяжэйшым стане, поўная адсутнасць рухаў ног і кісцей рук. На рэнтгенаграме: перралом-вывіх 6 і 7-га шэйных пазванкоў, іх змяшчэнне, і сціскванне спіннага мозга. Мулявін ужо быў у прытомнасці.

Па згодзе з пацыентам Варановіч пачаў доўгую і цяжкую аперацыю.

Зляцеліся музыканты, сядзелі под вокнамі клінікі.

Неўзабаве прыбылі тры маскоўскія прафесары.

*І. Варановіч:* Яны далі заключэнне, што мая аперацыя выканана сваечасова і адэкватна, рашылі некаторыя яшчэ аперацыі зрабіць у Маскве. Яго з Прэзідэнцкай бальніцы перавезлі ў Інстытут імя Бурдэнкі. Тых дэталяў я ўжо не ведаю.

Па сяе ідуць спрэчкі: ці варта было перавозіць хворага ў Маскву? Тут ён быў самым «ганаровым» пацыентам.

*І. Лучанок:* У Маскве ў рэанімацыі ляжаў у агульнай палаце: там жанчыны, дзеці. А Валодзя мне: «Ігарок! Мы яшчэ заспяваем!»

*Айцец Андрэй:* Пасля таямніцтва споведзі ён прамовіў: «Цяпер я пазнаў, што такое змірэнне. Я так легкадумна ставіўся да жыцця. Божа мяне змірыў. Я тут адчуў сэнс таго, што здарылася».

І далей: апошні непрыстойны калаўрот — ужо пад дзвярыма палаты нерухомага.

* * *

*У. Місевіч:* У маскоўскай клініцы Ігар Пеня «наводзіў масты»: «Хлопцы, Пенкіна сказала, трупам лягу, але каб гэтых нягоднікаў — так і перадайце ім! — нават блізка не было! Устрою скандал!» Гэты цэрбер прысутнічаў там у стане агрэсіі. Ігар Свечкін раіў нам тое ж: «Хлопцы, не лезьце». Яна не пускала не толькі нас: адсеў рабіла.

***В. Дайнэка:*** У бальніцы спіс людзей быў: каго пускаць.

***І. Кабзон:*** Няпраўда. Лёгка цяпер гаварыць: мы хацелі — нас не пускалі. Павінны былі кругласутачна сядзець пры палаце: дух яго ўнасіць з сабой!

***У. Місевіч:*** Канешне, мы павінны былі быць з ім у той час, павінны. Хай то будзе нашая віна. Не «хай», а яна ёсць. Кабзон, калі вінаваціць нас... не збіраюся спрэчыць... абсалютна правы.

І ўспаміны — чароўная машына памяці! — адкручваюць час назад.

***А. Кашапараў:*** У снах стаю на сцэне побач з Валодзем.

***У. Ткачэнка:*** «Сябры», «Верасы» — крыху лепш ці горш — гэта з беларускага пункту гледжання. Калі з Масквы глядзець, там ужо іншыя гурты, Кабзон, Пугачова. Але «Песняры» і там на вяршыні, а тыя, хто ў Беларусі былі побач, адышлі на сотае месца. А з сусветнага пункту гледжання, дык з Савецкага Саюза — толькі «Песняры».

***А. Мойчан:*** Цяпер нікому не трэба выстаўляць сябе вялікім і адзіным нашчадкам справы Мулявіна.

Вядома: ён адзін мог рабіць усё тое, што кожны з іх паасобку: іграць, спяваць, сачыняць, аранжыраваць, кіраваць. А ўжо ж і спрабуюць «выстаўляць сябе»!

* * *

А ён быў яшчэ жывы, хаця лёс адлічваў апошнія тыдні, дні, гадзіны яго зямнога тэрміну.

***С. Пенкіна:*** Выпрабаванні, што выпалі, асабліва ў апошнія месяцы, ён пераносіў годна.

Візіт сябра-кампазітара адбыўся перад новым, 2003-м годам. Яны агаварылі змест дыска «Творы Ігара Лучанка ў выкананні гурта „Песняры“».

***І. Лучанок:*** Я нахіліўся, пацалаваў яго. А ён: «Што так слаба цалуеш?»

І вось іронія лёсу: ліцэнзія ЛБ № 195 Рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству інтэлектуальнай уласнасці «РУПІС» была выдадзена праз два дні пасля скону Мулявіна, у дзень яго пахавання.

***Г. Паплаўскі:*** Надвор'е было пранізлівае: туман, слата. І – людскі натоўп, усе разумелі: нацыянальны скарб адыходзіць ад нас. Ніхто яго не «раскручваў»: сам узышоў на п'едэстал, заваяваў давер і людскую любоў.

***В. Тарас:*** Калі ён памёр, да мяне прыйшло адчуванне, што ён загінуў на той вайне, пра якую была наша праграма, – гэта цяпер ужо і пра яго, як пра салдата, які прайшоў «праз усю вайну».

З'явіліся прэміі і стыпендыі яго імя, выдадзены кніга і дыскі, усталяваны мемарыяльная дошка і помнік, створаны музей, яго імя носіць бульвар, што прылягае да філармоніі...

А далей – што?

А далей – усё: гісторыя «Песняроў» скончылася на 25-м кіламетры аўтадарогі Заслаўе – Калодзішчы паблізу вёскі Лапаравічы на Радаўніцу 14 траўня 2002 года ў 12 гадзін 40 хвілін.

* * *

Хто б ведаў сёння ў свеце «лявонаў», «песняроў» і «песнярат», калі б не славуты гурт? І яго б не было, каб не Мулявін. Не было б! І выпадковае шчасце наша, што асеў у Беларусі, а не ў Літве, Арменіі ці Расіі.

Кім бы ні былі сёння ўдзельнікі гуртоў з тае назвай – зоркамі сцэны, уладальнікамі фірм, забытымі пенсіянерамі, рызыковымі шукальнікамі «ісціны ў віне», – для нас, удзячных землякоў, яны назаўсёды застануцца светлымі хлопцамі, што дапытваліся «Ку-

палінка, а дзе ж твая дочка?», веселунамі, якія разам з Ясем «касілі канюшыну», песеннымі каханкамі «Веранік», «Алесей», «Александрын»... Такімі і ўвойдуць у гісторыю нацыянальнага мастацтва. Ды што там — «увойдуць»?! Ужо ўвайшлі.

***Голас Мулявіна:*** «Песняры» — вялікае слова, шмат да чаго абавязвае. Не гандлёвая марка, а вобраз мыслення, вобраз жыцця.

«Песняры» засталіся ў XX-м стагоддзі.

Краіна Беларусь у чаканні сваіх песняроў XXI-га стагоддзя: новых Гусоўскага і Купалы, Караткевіча і Быкава, новага Мулявіна.

Яны ўжо нарадзіліся.



## Бібліяграфія

**Владимир Мулявин: Нота судьбы (Воспоминания, интервью, исследования)** /Ред.-сост. Л. Крушинская/ Минск: «Мастацкая літаратура», 2004. — 446 с.

## З «Вікіпедыі»

Уладзімір Мулявін — беларускі артыст і кампазітар, народны артыст Беларусі (1979), Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1980), народны артыст СССР (1990), заснавальнік і мастацкі кіраўнік вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры».

Нарадзіўся 12.01.1941 г. ў Свярдлоўску (цяпер Екацярынбург). Маці — Акуліна Сяргееўна, швачка. Бацька — Георгій Мулявін — працоўны завода «Уралмаш», пакінуў сям'ю, калі Уладзіміру было 3 гады. У дзіцячым узросце пачаў захапляцца музыкай, у 12-гадовым узросце пачаў граць на гітары.

У 1956 г. — пасля 8-га класа школы — паступіў у Свярдлоўскае музычнае вучылішча, на аддзяленне струнных інструментаў. Выключаны з вучылішча за захапленне джазам, хутка быў прыняты назад, але кінуў па ўласным жаданні. У 1959 г. (у 18 гадоў) ажаніўся з Л. Кармальскай. У 1958—63 гг. працаваў музыкам у розных абласных філармоніях (Цюмень, Томск, Кемерава, Чыта, Петразаводск, Арэнбург), граў у ансамблі «Уралмашзавода».

У 1963 г. быў запрошаны на працу ў Беларускую дўзяржаўную філармонію. У 1965—1967 гг. служыў у войску пад Мінскам (в/ч 73964). Стварыў у вайсковай частцы вакальны квартэт, прымаў удзел у арганізацыі ансамбля БВА. Пасля сканчэння службы вярнуўся ў Беларускую дзяржаўную філармонію, нейкі час быў гіарыстам у ансамблі Юрыя Антонава.

У 1968 г. стварыў ВІА «Лявоны». У 1970 г. гэты ансамбль змяніў назву на «Песняры».

ВІА «Песняры» — удзельнік і лаўрэат мноства фестываляў і конкурсаў, у тым ліку: міжнародны фестываль песні ў Сопаце (Польшча, 1971), музычны кірмаш «MIDEM» (Каны, Францыя, 1975), «Varadero» (Гавана, Куба, 1983), фестываль духоўнага адзінства (Арызона, ЗША, 1994), міжнародны фестываль «Millenium» (Нью-Ёрк, ЗША, 2001).

### Узнагароды і прэміі У. Г. Мулявіна

Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1970).

Лаўрэат фестывалю песні «Залаты леў» (Лейпцыг, 1973).

Лаўрэат 2-га фестывалю палітычнай песні (Хельсінкі, 1978).

Галоўны прыз фірмы «Мелодыя» «Залаты дыск» (1982).

Медаль Францыска Скарыны (1994).

Ордэн Францыска Скарыны (2001).

21 студзеня 2001 г. у Маскве на Алеі Зорак закладзеная зорка ў гонар У. Мулявіна і ансамбля «Песняры».

У 2004 г. у гонар Мулявіна пераназваны бульвар у цэнтры Мінска (раней — імя Луначарскага).

У 2006 г. на Усходніх могілках Мінска ўсталявана надмагільная скульптурная кампазіцыя У. Мулявіну (скульптар А. Каструкоў, архітэктар С. Федчэнка).

15 траўня 2013 г. у Екацярынбургу на Плошчы зорак перад Тэатрам эстрады закладзеная зорка у гонар У. Мулявіна і ансамбля «Песняры».

6 кастрычніка 2014 г. у Екацярынбургу ўсталяваны помнік У. Мулявіну.

## ЗМЕСТ

Частка 1. «Песняры». Беларускі цуд ........ 5
Частка 2. «Песняры». Перарваны палёт ........ 21
Частка 3. Размяняныя «Песняры» ........ 46
Бібліяграфія ........ 62
З «Вікіпедыі» ........ 62
Узнагароды і прэміі У. Г. Мулявіна ........ 63

Навукова-папулярнае выданне

**АРЛОЎ Уладзімір Аляксандравіч**

**УЛАДЗІМІР МУЛЯВІН**

**РУСКІ ЧАЛАВЕК З БЕЛАРУСКАЙ ДУШОЙ**

Адказны за выпуск *Ю. Г. Хацкевіч*

Падпісана да друку 22.02.2016. Фармат 70×90 1/32.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 2,34. Ул.-выд. арк. 1,74.
Тыраж 500 экз. Заказ 442.

ТАА «Харвест». Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 1/17 ад 16.08.2013.
Вул. Кульман, д. 1, корп. 3, пав. 4, к. 42, 220013, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск, Рэспубліка Беларусь.



*Дайнека, Паплаўскі, У. Мулявін. 1982—1984 гг.*



*Уладзімір Мулявін і Уладзімір Арлоў. 19 студзеня 2001 года*



ISBN 978-985-18-3841-3

Уладзімір Мулявін (1941–2003) – выдатны дзеяч беларускай музычнай культуры, заснавальнік і мастацкі кіраўнік знакамітага гурта «Песняры». Менавіта ён разам са сваім гуртом пазнаёміў свет з краінай пад назвай Беларусь. І менавіта ён ва ўвесь голас узгадаў беларусам, што яны – беларусы. І што беларускія песні – цудоўныя!